Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

№ 47 (28663)

10 САКАВІКА 2018 г.

СУБОТА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

+TV ПРАГРАМА

«Лепш за ўсіх» — не пра ўсіх

СТАР. 5

Топ TV-прыгажунь

Вада — паказчык дабрабыту

ЛІЧБА ДНЯ

27-ю пазіцыю

заняла Беларусь у рэйтынгу фінансава-кансультацыйнага партала GOBankingRates, які апублікаваў чарговы топ-50 краін, у якіх выдаткі на жыццё самыя нізкія і куды варта пераехаць, каб траціць менш. «У Беларусі, на фоне чароўнай прыроды, сярод палацаў і крэпасцяў, вы адчуеце сябе, як у казцы. Кошт жыцця тут на 66 % ніжэйшы, чым у Нью-Ёрку», — гаворыцца ў каментарыі gobankingrates.com. Згодна з інфармацыяй аўтараў даследавання, цэны на прадукты ў Беларусі складаюць толькі 28 % ад нью-ёркскіх, а арэнда жылля абыдзецца на 89 % танней. Год таму ў гэтым рэйтынгу Беларусь займала 50-е месца. Самай таннай для жыцця краінай у свежым рэйтынгу названая Індыя. Адзначаецца, што былі прааналізаваны даныя па 115 краінах свету, а кошт выдаткаў параўноўваўся з цэнамі ў Нью-Ёрку.

ISSN 1990 - 763X

«...Гэй, маленства, жыва, смела

Выйдзем весну прывітаць!»

Фота Анатоля КІПЕШЧУКА.

У Коласавых Акінчыцах, там, дзе знаходзіцца хата-музей народнага паэта, мясцовыя дзеці аблюбавалі снежную горку. Васьмігадовы Уладзіслаў КАРП спяшаецца нацешыцца зімовым надвор'ем, якое вось-вось зменіцца цёплымі днямі.

■ Размова па сутнасці

НА ПАРОЗЕ «ЗАСЛУЖАНАГА АДПАЧЫНКУ»

Спецыялісты Мінпрацы і сацабароны адказалі на пытанні аб перадпенсійным узросце

Людзі, якім за 50, як правіла, трымаюцца за работу, таму што разумеюць: знайсці ў гэтым узросце добры варыянт працаўладкавання даволі складана. Хоць у нас ёсць закон, які забараняе дыскрымінацыю па ўзросце, наймальнікі часта неахвотна сустракаюць узроставых саіскальнікаў. Многія баяцца, што такія работнікі будуць часта хварэць і не вельмі старанна ставіцца да сваіх службовых абавязкаў, а маладыя начальнікі не вітаюць падначаленых, якія старэйшыя за іх, бо адчуваюць сябе з імі псіхалагічна некамфортна.
Асабліва ўразлівымі з'яўляюцца людзі ў перадпенсійным узросце. Ці ёсць для іх нейкія працоўныя гарантыі і льготы? Ці можа работадаўца скараціць або звольніць работніка за пару гадоў да пенсіі? І што рабіць, калі вы ўсё ж засталіся без працы?

СТАР. 4

■ Экспертыза

ЗНАЙСЦІ ПА ПАЛЬЦАХ

Чаму не зніжаецца актуальнасць дакталаскапіі?

Ці не самым вядомым у грамадстве кірункам дзейнасці судовых экспертаў з'яўляецца дактыласкапія. Вобраз інспектара з лупай, які шукае адбіткі пальцаў, трывала ўвайшоў у свядомасць дзякуючы заходнім кіна- і мультыплікацыйным стужкам. Хоць дактыласкапія з'яўляецца адным з самых старых крыміналістычных спосабаў ідэнтыфікацыі злачынцаў, актуальнасць яе не зніжаецца і дагэтуль. Крыху прыадкрыць над ёй завесу таямніцы карэспандэнт «Звязды» папрасіў старшага эксперта аддзела дактыласкапічных і партрэтных экспертыз упраўлення дактыласкапіі, балістыкі і партрэтнай ідэнтыфікацыі Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз (ДКСЭ) Алену ЛУЖЫНСКУЮ і галоўнага эксперта аддзела дактыласкапічных улікаў упраўлення дактыласкапіі, балістыкі і партрэтнай ідэнтыфікацыі ДКСЭ Яўгена ГУДА.

— Ледзь не па ўсіх крымінальных справах прызначаецца дактыласкапічная экспертыза. Што да расследаванняў, звязаных з незаконным абарачэннем наркотыкаў, то цяпер іх ледзь не палова ад агульнай колькасці. Крыху менш дактыласкапісты працуюць па справах, звязаных з забойствамі і нанясеннем цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Тут усё трывіяльна — пілі разам, слова за слова, узнік канфлікт, нехта схапіўся за нож...

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ПЯШЧОТА І СІЛА

Усё пазнаецца ў параўнанні. Каб зразумець, што вада гарачая, спачатку трэба дакрануцца да халоднай. Каб адчуць шчырую, цёплую жаноцкасць, варта пабачыць сапраўдных мужчын. Менавіта на такім кантрасце праходзяць уручэнні Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам дзяржаўных узнагарод і генеральскіх пагонаў. Ужо традыцыяй стала аб'ядноўваць ва ўрачыстасці мужных абаронцаў Айчыны і цудоўных жанчын, вартых кампліментаў не толькі за прыгажосць, але і за грамадскія і працоўныя дасягненні.

Фота БЕЛТА.

Залаты прызёр па фрыстайле XXIII зімовых Алімпійскіх гульняў 2018 года Ганна Гуськова атрымала ордэн Айчыны III ступені з рук Аляксандра Лукашэнкі.

Сярод узнагароджаных большасць — жанчыны. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што свята 8 Сакавіка пачыналася як міжнародны рух у абарону грамадзянскіх правоў жанчын, а цяпер стала нагодай для іх ушанавання. «Гэта знак глыбокай павагі і прызнанне выключна важнай ролі жанчын у грамадстве, — адзначыў беларускі лідар. — У вас — наша сіла і мужнасць, шчасце і душэўны спакой, радасць і натхненне. Вы, як і вясна, дорыце цеплыню, жаданне жыць і станавіцца лепшымі». Па словах Аляксандра Лукашэнкі, прызначэнне жанчыны — упрыгожваць свет, мужчыны — абараняць яго. І якія б сацыяльныя ролі мы ні прымяралі, важна не забывацца на гэта і такім чынам захоўваць у грамадстве гармонію адносін.

«Я заўжды казаў і сёння паўтару: беларускія жанчыны — самыя лепшыя і самыя прыгожыя, здольныя дзіўным чынам спалучаць у сабе сілу характару і незвычайную жаноцкасць. Многія з вас дасягаюць вялікіх вышынь, скажу як ёсць, часам нават у абсалютна нежаночых прафесіях. Асабліва гэта прыкметна ў спорце», — сказаў Прэзідэнт.

Вядома ж, самых сардэчных слоў заслугоўваюць шматдзетныя маці, якія штодзённа здзяйсняюць подзвіг, выхоўваючы дзяцей. «На іх плячах не меншая фізічная і эмацыянальная нагрузка, а таксама велізарная адказнасць за будучыню сваіх дзяцей, нашых грамадзян. Гэтыя жанчыны аддаюць ім усё сваё жыццё», — лічыць кіраўнік дзяржавы. Асаблівай павагі заслугоўваюць тыя, хто працуе ў такіх сферах, як адукацыя і медыцына, культура і мастацтва, эканоміка і дзяржаўная служба.

Акрамя дзясяткаў прадстаўніц слабага полу шасцёра ваенных атрымалі высокія званні, трое — генерал-маёраў. Па словах Прэзідэнта, яны — прыклад адвагі, гонару і мужнасці, сапраўдныя мужчыны, якія ў няпросты час выбіраюць прафесію «Радзіму абараняць». Але разам з новымі пагонамі ўзрастае і адказнасць. «Упэўнены, вы з гонарам справіцеся з ускладзенымі на вас абавязкамі», — адзначыў беларускі лідар.

Напрыканцы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў усіх прысутных жанчын з надыходзячым святам.

Ганна ГУСЬКОВА, залаты прызёр XXIII зімовых Алімпійскіх гульняў 2018 года ў Пхёнчхане па фрыстайле:

— Не асабліва проста, з аднаго боку, а з другога — вельмі прыемна, калі за цябе перажывае ўся краіна, гэта многага каштуе. Гэта тыя моманты, дзеля якіх варта жыць. Дзякуй усім за падтрымку! Пакуль складана сказаць, як зараз будуць складвацца нашы трэніроўкі, але тое, што я буду працягваць трэніравацца, гэта адназначна. Пакуль вольнага часу няма, большая яго частка ідзе на сустрэчы з прэсай і спробы асэнсаваць усё, што адбылося. Што змянілася пасля выступлення ў Пхёнчхане? Больш медыйнай стала, але ў іншым — пакуль складана сказаць, я яшчэ не адышла ад падзей лютага. Яшчэ і тое, што атрымала заслужанага майстра спорту, таксама значная падзея для мяне.

Вераніка ПУСТАВІТ.

ПРЫЗНАННЕ ЗА ШМАТГАДОВУЮ ПРАЦУ

Ордэнамі, медалямі і ганаровымі званнямі Рэспублікі Беларусь адзначаны заслугі 89 работнікаў розных сфер. Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Узнагароды прысуджаны за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, выключную адвагу і мужнасць, праяўленыя ў барацьбе са злачыннасцю, пры выратаванні людзей на пажары, значны асабісты ўклад у газіфікацыю краіны, распрацоўку і мадэрнізацыю ўзораў узбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі, заслугі ў сферы судова-экспертнай дзейнасці, сацыяльнай абароны насельніцтва, аховы здароўя, энергетыкі, навукі, адукацыі, культуры і спорту.

Работнікі розных галін узнагароджаны медалямі за адзнаку ў воінскай службе, ахове грамадскага парадку, дзяржаўнай граніцы, медалём «За працоўныя заслугі», медалём Францыска Скарыны. Прысвоены ганаровыя званні дзеячам у сферах навукі, медыцыны, энергетыкі, спорту, праваахоўнай дзейнасці.

Кіраўнік дзяржавы падпісаў распараджэнне, у адпаведнасці з якім Падзяка Прэзідэнта за значны ўклад у развіццё сельскагаспадарчай галіны, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў аб'яўлена калектыву работнікаў бялыніцкага СВК «Калгас «Радзіма».

Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена тром дзясяткам работнікаў розных сфер дзейнасці, у тым ліку за высокі прафесіяналізм, уклад у развіццё АПК і сельгасвытворчасці, умацаванне абараназдольнасці Беларусі, рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы сацыяльнай абароны насельніцтва, укараненне ў медыцынскую практыку сучасных тэхналогій пратэзавання і рэабілітацыі, развіццё прыярытэтных напрамкаў медыцынскай навукі, дасягненні ў сацыяльна-эканамічным развіцці, рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, развіццё картаграфіі ў Беларусі, дасягненне высокіх паказчыкаў у пажарна-выратавальным спорце.

Прэзідэнт аб'явіў падзяку і Анатолю Сланеўскаму, намесніку галоўнага рэдактара рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», за шматгадовую плённую працу, высокае прафесійнае майстэрства, значны асабісты ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі. Віншуем калегу!

Жанчынам падарылі свята

Напярэдадні 8 Сакавіка віншаванні ад старшыні Магілёўскага аблвыканкама Уладзіміра ДАМАНЕЎСКАГА атрымалі 30 прадстаўніц вобласці, сярод якіх шматдзетныя маці, а таксама лідары працоўнай і грамадскай дзейнасці.

— У дзяцінстве, юнацтве, дарослым жыцці вы для нас апора і падтрымка, — адзначыў у сваёй віншавальнай прамове Уладзімір Даманеўскі. — Як бы ні змянялася жыццё, у якіх бы сферах дзейнасці ні працавалі, вы заўсёды застаяцеся цудоўнымі і заслугоўваеце самых цёплых слоў.

Ва ўрачыстай абстаноўцы кіраўнік рэгіёна ўручыў ордэн Маці шасці жанчынам, якія нарадзілі і выхавалі пяцярых і болей дзяцей, — хатнім гаспадыням з Магілёўскага, Хоцімскага і Асіповіцкага раёнаў — Іне Баканавай, Алесі Кудраўцавай, Валянціне Дзярабінай, швачцы таварыства з абмежаванай адказнасцю «Анатэкс плюс» з Магілёва Наталлі Лабанавай, а таксама Алене Асіповіч і Людміле Садковай, якія працуюць прыбіральшчыцамі ў Мсціслаўскай і Быхаўскай цэнтральных раённых бальніцах.

А інспектары ДАІ традыцыйна віншавалі жанчын-кіроўцаў. Акцыю падтрымалі камунальнае прадпрыемства «Магілёўзелянбуд», крама аўтазапчастак «Аўто 1», страхавая кампанія «Таск» і сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Контэ Трэйд». Іх прадстаўнікі таксама ўвайшлі ў віншавальны дарожны патруль. Разам з цюльпанамі жанчыны атрымалі зніжкавыя сертыфікаты, сувеніры і падарункі.

— Акцыя праходзіла з 1 па 8 сакавіка, але пік віншаванняў прыйшоўся на 7 сакавіка, — паведаміла **старшы інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Таццяна СТАРАСОТНІКАВА.** — Прыемную місію ў гэты дзень выконвалі тры экіпажы ДАІ. Толькі ў Магілёве падчас святочнай акцыі падарункі атрымалі каля 200 жанчын. Акрамя гэтага віншавальныя патрулі працавалі і ў раёнах вобласці.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ТРАМП ПРЫНЯЎ ПРАПАНОВУ КІМ ЧЭН ЫНА АБ СУСТРЭЧЫ

Сустрэча паміж цяперашнімі кіраўнікамі ЗША і Паўночнай Карэі стане прэцэдэнтам у гісторыі міжнародных адносін, адзначае ВВС. «Я сказаў прэзідэнту Трампу, што падчас нашай сустрэчы з лідарам Паўночнай Карэі Кім Чэн Ынам той заявіў аб сваёй прыхільнасці да дэнуклеарызацыі. Кім паабяцаў, што Паўночная Карэя ўстрымаецца ад далейшых ядзерных і ракетных выпрабаванняў», — заўважыў саветнік прэзідэнта Паўднёвай Карэі па бяспецы Чон Ы Ён. Пры гэтым Кім Чэн Ын пагадзіўся сустрэцца з амерыканскім лідарам «як мага хутчэй». У адказ Дональд Трамп заявіў, што правядзе перагаворы з кіраўніком КНДР да мая бягучага года. Гэта пацвердзіла прэс-сакратар Белага дома Сара Сандэрс.

З ЗАМАРОЖАНЫХ РАХУНКАЎ КАДАФІ ЗНІКЛІ МІЛЬЯРДЫ ЕЎРА

Бельгійскія ўлады выявілі знікненне 10 мільярдаў еўра з замарожаных лівійскіх актываў. Грошы захоўваліся ў банку Euroclear Bank і прапалі ў перыяд з 2013 па 2017 год. Пра гэта паведаміў «Інтэрфакс» са спасылкай на Le Vif. Сродкі знаходзіліся на чатырох рахунках, адкрытых для Libyan Investment Authority і Libyan Foreign Investment Company. Па стане на 29 лістапада 2013 года на іх было больш за 16 мільярдаў еўра. Аднак увосень 2017 года, калі ўлады каралеўства пасля расследавання справы аб адмыванні грошай збіраліся накласці арышт на 16 мільярдаў, высветлілася, што на рахунках увогуле засталося толькі пяць мільярдаў. Сродкі кантраляваліся найбліжэйшым акружэннем зрынутага лівійскага лідара Муамара Кадафі і былі замарожаны па рашэнні ААН у 2011 годзе. Бельгійскія ўлады, са свайго боку, адзначылі, што не прымалі рашэння аб размарожванні актываў.

КІТАЙ НАЦЭЛІЎСЯ ЗРАБІЦЬ ЮАНЬ СУСВЕТНАЙ ВАЛЮТАЙ

Улады Кітая працягнуць павольна спрыяць інтэрнацыяналізацыі юаня, у тым ліку за кошт далейшага адкрыцця свайго фінансавага рынку. Пра гэта заявіў кіраўнік Народнага банка Кітая Чжоу Сяочуань, паведаміла РІА Навіны. «У працэсе інтэрнацыяналізацыі юаня былі прыняты дастатковыя меры, якія цяпер дазваляюць выкарыстоўваць яго ў гандлі і ў інвестыцыях. Акрамя таго, юань быў уключаны ў кошык валют SDR. Асноўныя працэдуры ўжо праведзены», — сказаў Чжоу Сяочуань. Паводле яго слоў, трэба дастатковы час, каб удзельнікі сусветнага рынку перайшлі да разлікаў у кітайскай валюце. Але Кітай зробіць усё, каб ішоў працэс інтэрнацыяналізацыі юаня.

ГРУЗІЯ МАБІЛІЗУЕЦЦА НА БАРАЦЬБУ З КЛАПАМІ

Пра гэта паведамляе «Інтэрфакс». У Тбілісі прайшоў міжнародны сімпозіум «Мармуровы клоп (Halyomorpha halys) — глабальны выклік, міжнародны вопыт і найлепшыя шляхі вырашэння праблем». Амерыканцы расказалі, што ў ЗША з мармуровымі клапамі змагаюцца 12 гадоў. Кампанія Trece Inc прыйшла да высновы, што перамагчы шкодніка можна толькі комплексным падыходам. Як вядома, летась мармуровыя клапы знішчылі ў Грузіі ўраджай фундуку, кукурузы і садавіны. Хімічную апрацоўку правялі на 100 тысячах гектараў, але распаўсюджванне насякомых не ўдалося спыніць. У тым жа годзе клоп пашкодзіў палову ўраджаю мандарынаў у Абхазіі.

■ Жыллёвая палітыка

«Далёўку» падкарэктавалі

Зараз цалкам падрыхтаваны і знаходзіцца ў Саўміне праект Указа № 263, які ўлічвае вопыт папярэдняга перыяду рэалізацыі аб'ектаў долевага будаўніцтва, паведаміў рэдакцыі начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ.

Асноўны момант змяненняў заключаецца ў зняцці ўмовы абавязковага ўнясення ўласных сродкаў арганізацыямі УКБ і прадпрыемствамі буйнапанэльнага дома-будавання (БПД) для таго, каб прыцягваць сродкі грамадзян. Бо цяпер яны павінны ўкласці ў справу 15 % ад кошту дома ўласных сродкаў, а толькі потым пачынаць збіраць сродкі дольшчыкаў. У няпростай эканамічнай сітуацыі буйныя абаротныя сродкі маюць нямногія прадпрыемствы. Для УКБ і структур БПД гэта стала праблемай. «Таму мы прапануем увесці норму, калі менавіта УКБам і прадпрыемствам з доляй дзяржуласнасці больш за 50 % дазволяць з моманту пачатку будаўніцтва прыцягваць сродкі грамадзян. Заўважу, такое фінансаванне паслабленне прапануецца толькі для дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый камунальнай формы ўласнасці», — удакладніў Аляксандр Горваль.

Для дзяржпрадпрыемстваў стаў праблемай і продаж ужо гатовага жылля, пабудаванага па долевым алгарытме... Унесена наступная прапанова ў праект указа, якая датычыцца працэдуры рэалізацыі такога долевага жылля. Калі ў долевым будаўніцтве дом быў пабудаваны, але не ўсе кватэры рэалізаваны ў працэсе ўзвядзення, то будзе дазволена гэтым арганізацыям (УКБам і структурам БПД) прадаваць ужо гатовыя кватэры з вяртаннем атрыманых сродкаў на ўласныя рахункі гэтых прадпрыемстваў. Цяпер жа калі прадаюцца гатовыя кватэры ў долевым доме, то грошы паступаюць у бюджэт. А гэта вымыванне абаротных сродкаў.

«Змены ва ўказ аб долевым будаўніцтве цяпер у Саўміне. Чакаецца, што ў найбліжэйшы час яны будуць прынятыя», — сказаў Аляксандр Горваль.

Сяргей КУРКАЧ

■ Фінансы

Золатавалютныя рэзервы склалі амаль 7,1 млрд долараў

У Беларусі ў лютым рэзервы краіны выраслі на 9,5 %, паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка

У прэс-службе Нацбанка адзначылі, што міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі на 1 сакавіка, паводле папярэдніх даных, склалі 7,093 млрд долараў (у эквіваленце). За люты золатавалютныя рэзервы выраслі на 616,1 млн (на 9,5 %) долараў пасля зніжэння ў студзені 2018 года на 837,9 млн (на 11,5 %) долараў.

Павелічэнню рэзервовых актываў у лютым спрыяла паступленне сродкаў ад продажу Міністэрствам фінансаў еўрааблігацый, ад продажу на ўнутраным рынку Нацыянальным банкам і Мінфінам аблігацый, намінаваных у замежнай валюце. Акрамя таго, на рэзервы станоўча паўплывала паступленне замежнай валюты ў бюджэт, у тым ліку ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты, а таксама купля замежнай валюты на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы. Урадам і Нацыянальным банкам у лютым выканана знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на суму каля 470 млн долараў.

Згодна з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2018 год, аб'ём міжнародных рэзервовых актываў на 1 студзеня 2019 года з улікам пагашэння ўнутраных і знешніх абавязацельстваў у замежнай валюце павінен скласці не менш за 6 млрд долараў.

Сяргей КУРКАЧ

ЗНАЙСЦІ ПА ПАЛЬЦАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Увогуле, на якія пытанні можа адказаць эксперт-дактыласкапіст?

— Ён шукае сляды на пэўных аб'ектах, высвятляе іх прыдатнасць да ідэнтыфікацыі. Калі дактыласкапічная карта ў нас ужо ёсць у базе даных аўтаматызаванай дактыласкапічнай сістэмы — высветліць асобу чалавека даволі лёгка. Больш за тое, адбіткі пальцаў рук могуць распавесці і пра пол, узрост, але гэтыя характарыстыкі даюцца толькі ў варыянтнай форме. Разам з тым пакуль што не існуе ў свеце методык, якія б маглі з дакладнасцю 99,9 працэнта вызначыць антрапалагічныя параметры даследуемага па папілярных лініях пальцаў. І, канешне ж, пры аналізе слядоў на прыладзе здзяйснення злачынства важна вызначыць, менавіта якія пальцы якой рукі там пакінуты.

— Электронная база нам вельмі дапамагае, — працягвае Яўген Гуд. — У дакамп'ютарныя часы працэс быў вельмі працаёмкі. Для гэтага на кожную дактылакартку выводзіліся адмысловыя формулы, па якіх у ручным рэжыме адбываўся пошук. Праверка па ўліках слядоў пальцаў рук, знойдзеных на месцах злачынства, ажыццяўлялася толькі пры наяўнасці падазраваных. Што заканамерна запавольвала работу. Зараз жа ўсе карткі аўтаматызаваны, што дазваляе ў самыя кароткія тэрміны ідэнтыфікаваць сляды рук на месцах здарэнняў і высветліць асобу невядомага чалавека. Самая старая дактылакартка ў нашым архіве датавана 1945 годам. На жаль, падчас Вялікай Айчыннай вайны картатэкі былі страчаны, іх не паспелі вывезці з-за імклівага наступу немцаў. Некаторы час дактакарткі друкаваліся на шчыльнай нямецкай паперы, якая паступала да нас у якасці рэпарацый. Яны і цяпер выглядаюць амаль як новыя.

— А калі, напрыклад, было знойдзена невядомае цела?

— Тады таксама абавязкова здымаюцца адбіткі пальцаў. Пасля па базе яны звяраюцца. Калі, вядома, звесткі аб гэтым чалавеку трапілі ў нашу базу, мы параўноўваем дзве дактылакарткі і высвятляем, хто ж перад намі.

— Кінафільмы прывучылі нас да таго, што для зняцця адбіткаў пальцы прыціскаліся да падушачкі з чарнілам, якое пасля было цяжка змыць. А як цяпер гэта адбываецца?

— Зараз існуюць лічбавыя дактыласкапічныя сканеры. Але стары метад з дактафарбай пакуль з'яўляецца найлепшым спосабам нашага даследавання. Больш за тое, пры выездзе на месцы здарэння эксперты тэрытарыяльных органаў яго і выкарыстоўваюць.

— А ці даводзіцца працаваць з адбіткамі ног?

— Рэдка, але здараюцца і такія экспертызы. Адно з такіх даследаванняў было звязана са справай аб забойстве. На лінолеуме застаўся крывавы адбітак босай нагі. Калі меркаванага злачынцу затрымалі, экспертыза пацвердзіла, што адбітак належыць менавіта гэтаму чалавеку.

— Што знаходзіцца ў экспертным чамаданчыку дактыласкапіста, акрамя фарбы?

— Калі пачытаць даўнія дэтэктывы, то там, як правіла, згадваецца парашок. Шырока ўжываецца ён і цяпер. Але ёсць розніца — для металічных паверхняў патрэбна адно рэчыва, для немагнітных — іншае... Шмат што залежыць і ад колеру паверхні. Напрыклад, цяпер у нашым арсенале ёсць флуарэсцэнтныя парашкі. След пальца пасля будзе свяціцца ва ўльтрафіялеце. Таксама могуць прымяняцца і спрэй, і пасты... Адным словам, рашэнне аб выбары метаду прымаецца ўжо на месцы. След пальца можа спакойна захоўвацца некалькі гадоў.

Мы аднойчы рабілі экспертызу па «закладцы» наркатычных сродкаў. На маленькім кавалачку паперы памерам літаральна 20х20 міліметраў выявіўся след рукі. Яго змясцілі ў базу. Так і знайшлі злачынцу.

— Ці звяртаюцца да вас людзі не ў парадку крымінальнай справы?

— Вось неяк патэлефанаваў дзед, — успамінае **начальнік аддзела Дзмітрый САЧУК.** — І просіць — правядзіце экспертызу. Пытаюся: «Што ў вас здарылася?» — «Хачу, каб вы сказалі, што мой унук украў у мяне грошы з тумбачкі». «Дапусцім, а як я даведаюся, што гэта яго сляды?» «А я прынясу келіх». Сітуацыя і смешная, і адначасова сумная. Каб высветліць прыналежнасць слядоў, то трэба чалавека дактыласкапіраваць. Грамадзяніна не ў межах крымінальнай справы мы можам праверыць толькі па яго пісьмовай заяве. І хто ж на гэта пагодзіцца?

Ці вось у адной жанчыны ўкралі сумку на работы. Яна звярнулася да нас, паколькі падазравала кагосьці з калег. Але спярша ісці трэба было ў міліцыю...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Даведка «Звязды»

Сучасная дактыласкапія пайшла з Індыі. Паўтара стагоддзя таму англійскі каланіяльны чыноўнік Уільям Гершэль заўважыў, што індусы падчас подпісу дакументаў пакідалі не аўтограф, а адбітак пальца. Тое была містычная ідэя, што гэта абавязвае чалавека больш за звычайны подпіс. Аднойчы з цікаўнасці баранет Гершэль узяўся за вывучэнне адбіткаў пальцаў. І высветліў, што двух аднолькавых не існуе. Так і з'явіўся самы вядомы метад ідэнтыфікацыі.

ВІКТОРЫЯ ВІКТОРЫІ

Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка пасля працяглага перапынку пераможна вярнулася ў сусветны тэнісны тур.

У першым раўндзе турніру ў амерыканскім Індыян-Уэлсе Азаранка, якая цяпер займае 204-е месца ў рэйтынгу WTA, за 1 гадзіну 43 хвіліны нанесла паражэнне 70-й ракетцы планеты брытанцы Хізэр Уотсан. Першы сет беларуска пачала вельмі ўпэўнена, калі павяла ў ліку 5:1. Пасля гэтага саперніца перахапіла ініцыятыву і скараціла разрыў да мінімуму — 5:4. Але Вікторыя сабралася і, трэці раз выйграўшы чужую падачу, перамагла — 6:4. Другая партыя прайшла па тым жа сцэнарыі: Азаранка адразу вырвалася наперад, Уотсан даганяла, але ў выніку беларуска зноў была мацнейшая — 6:2.

Пасля матча Вікторыя Азаранка сказала, што вельмі рада зноў выйсці на корт, вярнуцца і адчуць усе гульнявыя эмоцыі і дамагчыся перамогі.

У другім крузе спаборніцтваў BNP Paribas Open Азаранка пазмагаецца з дзейнай чэмпіёнкай US Open амерыканкай Слоан Стывенс (13-я ў сусветным рэйтынгу).

Да гэтага турніру Вікторыя Азаранка апошні раз гуляла ў ліпені 2017 года на Уімблдоне, пасля чаго была вымушана была вырашаць праблемы, звязаныя з апекай над сваім дзіцем.

Вяртанне атрымалася ўдалым, і цяпер Азаранка працягне выступленне на кортах Індыян-Уэлса, дзе яна ў 2012 і 2016 гадах станавілася чэмпіёнкай.

Эдвард Вайніловіч у Слуцку

Пабачылі свет матэрыялы леташняй навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай знакамітаму беларускаму дзеячу, — «Беларусь, Слуцкі край і Эдвард Вайніловіч».

Праект «раскруткі» гэтага націкавейшага персанажа беларускай гісторыі другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзя ўжо набывае ўсё болей шырокія абсягі. І гэта проста выдатна. Рэфарматар, патрыёт сваёй Айчыны, ён і зараз можа служыць прыкладам асобы, якая мела ўяўленні пра дзяржаўнае будаўніцтва Беларусі.

Член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі дасведчаны гісторык Аляксандр Каваленя, адкрываючы згаданую канферэнцыю ў Слуцку ў верасні мінулага года, зазначыў: «Упершыню апынуўшыся ў старажытным Слуцку ва ўзросце 14 гадоў, Эдвард Вайніловіч да канца жыцця захаваў вялікую любоў да гэтага горада. Ён напісаў шматлікія гістарычныя экскурсы пра Алелькавічаў, Радзівілаў, «персіярню», пратэстанцкія цэрквы і іншыя славутасці горада на Случы». І далей: «Пра любоў Эдварда Вайніловіча да Случчыны сведчыць таксама і тое, што ён, атрымаўшы грунтоўную адукацыю ў Расіі, Германіі і Бельгіі прыехаў працаваць у свой родны Слуцкі павет. З'яўляючыся старшынёй Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, Эдвард Вайніловіч ператварыў Случчыну ў адзін з самых паспяховых сельскагаспадарчых рэгіёнаў Усходняй Еўропы. У эксперыментальныя гаспадаркі Слуцкага краю прыязджалі пераймаць вопыт аграномы і землеўласнікі з Прыбалтыкі, Польшчы, Украіны і Расіі. Безумоўна, Эдвард Вайніловіч зрабіў вялікі ўклад у справу сацыяльна-эканамічнага, духоўна-культурнага і грамадска-палітычнага развіцця Беларусі. Ён спалучаў у сабе глыбокі патрыятызм, шчырую хрысціянскую веру і руплівую працу на карысць роднага краю. Такі прыклад актуальны і сёння».

На канферэнцыі ў Слуцку выступілі з грунтоўнымі дакладамі, паведамленнямі гісторыкі Вадзім Аніпяркоў, Наталля Анофранка, Мікалай Волкаў, Аляксандр Ерашэвіч і шмат хто яшчэ. Акадэмік Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі Міхаіл Касцюк разгледзеў тэму эвалюцыі грамадскіх поглядаў і дзеянняў Эдварда Вайніловіча. У 1917 годзе, адзначае М. Касцюк, Эдвард Вайніловіч працаваў у земскіх арганізацыях разам з дзеячамі беларускага руху — А. Смолічам, Р. Скірмунтам і інш., ім былі падтрыманы захады па ўтварэнні Беларускай Народнай Рэспублікі. Ён удзельнічаў у пасяджэннях яе Рады.

Кніга матэрыялаў Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі ў Слуцку пабачыла свет у выдавецтве «Медысонт» у серыі «Беларусь і Эдвард Вайніловіч».

Мікола БЕРЛЕЖ.

НА ПАРОЗЕ «ЗАСЛУЖАНАГА АДПАЧЫНКУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі сумесна са «Звяздой» правяло круглы стол «Усё аб перадпенсійным узросце», на якім спецыялісты пастараліся адказаць на найбольш распаўсюджаныя пытанні, што ўзнікаюць у людзей у перадпенсійным узросце. У абмеркаванні прынялі ўдзел **начальнік упраўлення арганізацыі пенсійнага забеспячэння галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Мінпрацы і сацабароны Алена ДРОНАВА, кансультант галоўнага юрыдычнага ўпраўлення Таццяна РАХУБА і кансультант упраўлення палітыкі занятасці Ірына ШАЎЧЭНКА.**

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Злева направа: **кансультант галоўнага юрыдычнага ўпраўлення Мінпрацы і сацабароны Таццяна РАХУБА, начальнік упраўлення арганізацыі пенсійнага забеспячэння галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Алена ДРОНАВА, кансультант упраўлення палітыкі занятасці Ірына ШАЎЧЭНКА.**

ГАРАНТЫІ КАЛЕКТЫЎНАГА ДАГАВОРА

— Што такое перадпенсійны ўзрост і як ён будзе змяняцца з павелічэннем пенсійнага ўзросту?

Таццяна РАХУБА:

— Перадпенсійны ўзрост вызначаны Указам Прэзідэнта ад 12 красавіка 2000 года № 180 і ўстаноўлены за два гады да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту. Як можна заўважыць, мы адышлі ад канкрэтнай прывязкі да ўзросту, паколькі пенсійны ўзрост будзе змяняцца. Адпаведна, будзе змяняцца і перадпенсійны ўзрост.

У цяперашні час у нас ідзе паэтапнае штогадовае павышэнне на 6 месяцаў агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, і з 1 студзеня 2022 года мужчыны будуць выходзіць на пенсію ў 63 гады, а жанчыны — у 58 гадоў. У гэтым годзе пенсійны ўзрост для жанчын складае 56 гадоў, для мужчын 61 год. Адпаведна, перадпенсійны ўзрост надыходзіць у 54 гады для жанчын і ў 59 гадоў — для мужчын.

— Якія працоўныя гарантыі прадугледжаны для перадпенсійнага ўзросту?

Таццяна РАХУБА:

— Незалежна ад віду прадпрыемства заканадаўча прадугледжана гарантыя падаўжэння кантракта ці заключэння новага работнікам, якія дасягнулі перадпенсійнага ўзросту. Але гэтая гарантыя дзейнічае толькі ў тым выпадку, калі работнік не мае дысцыплінарных спагнанняў. Інакш кажучы, каб наймальнік працягнуў кантракт альбо заключыў новы, работнік не павінен мець ніякіх заўваг, вымоў, зніжэння прэмій у выніку парушэння працоўнай альбо вытворча-тэхналагічнай дысцыпліны. У адваротным выпадку наймальнік можа прыняць рашэнне аб непрацягненні працоўных адносін, нягледзячы на перадпенсійны ўзрост работніка, — і гэта будзе ў рамках закона. Больш ніякіх гарантый закон у дачыненні да такіх работнікаў не прадугледжвае.

Ніхто не можа абавязаць наймальніка ўзяць на працу чалавека, які яго не задавальняе як работнік, не падыходзіць па нейкіх крытэрыях. Пры разглядзе кандыдатуры на вакантнае працоўнае месца наймальнік мае права выбару работніка, паколькі ў першую чаргу ён нясе адказнасць за эфектыўнае функцыянаванне арганізацыі ў цэлым.

Але хачу адзначыць, што калектыўныя дагаворы і пагадненні могуць уключаць больш шырокія нормы. І на практыцы ёсць прыклады, калі ў калектыўным дагаворы перадпенсійны ўзрост устанаўліваецца, скажам, за тры гады да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту. Гэта значыць, па жаданні працоўнага калектыву могуць быць устаноўленыя больш шырокія гарантыі, чым гэта прапісана ў законе.

— Як будзе мяняцца ўзрост датэрміновага выхаду на пенсію ў сувязі з павышэннем пенсійнага ўзросту?

Алена ДРОНАВА:

— Пенсійнае заканадаўства прадугледжвае права датэрміновага выхаду на пенсію з улікам занятасці ў асаблівых умовах працы, а таксама з улікам працяглай занятасці ў асобных відах прафесійнай дзейнасці. Такім правам валодаюць таксама асобы з пэўным сацыяльным статусам: шматдзетныя маці, бацькі дзяцей-інвалідаў, маці загінулых вайскоўцаў і некаторыя іншыя катэгорыі.

Устаноўлены ўзрост датэрміновага выхаду на пенсію, як і агульнаўстаноўлены пенсійны ўзрост, з кожным годам павышаецца на 6 месяцаў. Але пры гэтым розніца — напрыклад, на 5 або на 10 гадоў раней — захоўваецца.

— Ці можа беспрацоўны перадпенсійнага ўзросту датэрмінова выйсці на пенсію?

Ірына ШАЎЧЭНКА:

— Беспрацоўны, які мае права на дапамогу па беспрацоўі на працягу 52 каляндарных тыдняў, у выпадку немагчымасці працаўладкавання можа па прапанове службы занятасці выйсці на датэрміновую пенсію, але не раней чым за год да агульнаўстаноўленага ўзросту.

Асобна хачу звярнуць увагу, што для таго, каб мець права на дапамогу па беспрацоўі на працягу 52 каляндарных тыдняў, беспрацоўны мужчына павінен мець стаж не менш за 38 гадоў, жанчына — не менш за 33 гады. І пры гэтым яны павінны мець права на такую дапамогу наогул, таму што пры рэгістрацыі ў якасці беспрацоўнага не кожнаму прызначаецца дапамога па беспрацоўі.

Напрыклад, у такой дапамозе можа быць адмоўлена таму, хто быў звольнены з папярэдняга месца працы па ўласным жаданні альбо па пагадненні бакоў (калі быў заключаны працоўны дагавор на нявызначаны тэрмін), а таксама за прагул і г. д. Але калі работніку не быў працягнуты кантракт альбо ён быў звольнены па скарачэнні, гэта лічыцца важкай прычынай і дапамога па беспрацоўі будзе прызначана.

Давайце яшчэ спынімся на такім паняцці, як немагчымасць працаўладкавання. Служба занятасці вырашае гэтае пытанне індывідуальна, бо ў кожным індывідуальным выпадку крытэрыі прыдатнай працы могуць быць свае. Напрыклад, калі чалавек звярнуўся пасля працяглага перапынку ў працы, для яго практычна любая прапанаваная праца будзе лічыцца прыдатнай. Калі чалавек звольніўся і адразу пасля гэтага звярнуўся ў службу занятасці, для яго прыдатнай будзе лічыцца праца, якая адпавядае яго адукацыі, досведу.

І трэба яшчэ раз адзначыць, што вызначальным фактарам для таго, каб пайсці на датэрміновую пенсію, служыць не жаданне беспрацоўнага — гэтая ініцыятыва павінна зыходзіць ад службы занятасці менавіта ў выпадку немагчымасці працаўладкавання.

Таксама паводле арт. 22 Закона «Аб занятасці насельніцтва» на датэрміновую пенсію можа пайсці работнік, які быў звольнены ў сувязі з ліквідацыяй прадпрыемства, але не раней чым за 2 гады да агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту і таксама ў выпадку немагчымасці далейшага працаўладкавання.

КАГО МОГУЦЬ ЗВОЛЬНІЦЬ У ПЕРАДПЕНСІЙНЫМ УЗРОСЦЕ?

Пытанне чытача:

— Я дасягнула пенсійнага ўзросту, але пенсія мне не прызначаная, бо недастатковa стажу. Хачу дапрацаваць стаж. Ці магу я звярнуцца ў службу занятасці па дапамогу? Ці зарэгіструюць мяне як беспрацоўную?

Ірына ШАЎЧЭНКА:

— Забарона на рэгістрацыю ў якасці беспрацоўнага ўводзіцца толькі ў дачыненні да грамадзян, якім прызначана пенсія па ўзросце, за выслугу гадоў або прафесійная пенсія.

Такім чынам, калі вы дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, але пенсія вам не прызначана, вы маеце права на рэгістрацыю ў якасці беспрацоўнага. І вам, нароўні з іншымі беспрацоўнымі, будуць выплачвацца прадугледжаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам аб занятасці сацыяльныя выплаты ў выглядзе дапамогі па беспрацоўі, стыпендыі ў перыяд навучання па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, матэрыяльнай дапамогі беспрацоўным і членам іх сем'яў, якія знаходзяцца на іх утрыманні, а таксама будзе аказвацца неабходнае садзейнічанне ў працаўладкаванні, у тым ліку і накіраванне на навучанне, аказанне садзейнічання ў арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці з фінансавай падтрымкай у выглядзе субсідыі.

Пытанне чытача:

— Я прынятая на працу на час адсутнасці асноўнага работніка з заключэннем працоўнага дагавора. Ці могуць мяне звольніць у выпадку выхаду асноўнага работніка з сацыяльнага водпуску па доглядзе дзіцяці, калі мне застаўся толькі год да дасягнення пенсійнага ўзросту?

Таццяна РАХУБА:

— Так, могуць. Пры прыёме на працу на час выканання абавязкаў часова адсутнага работніка з вамі як з замяшчальным работнікам быў заключаны тэрміновы працоўны дагавор. У выпадку выхаду асноўнага работніка на працу тэрміновы працоўны дагавор, заключаны з работнікам, прынятым на час адсутнасці асноўнага работніка, скасоўваецца. На ўказанай падставе можа быць звольнены любы работнік, у тым ліку і перадпенсійнага ўзросту.

Гарантыі па абавязковым прадаўжэнні працоўных адносін для работнікаў перадпенсійнага ўзросту распаўсюджваюцца толькі на тых, хто працуе па кантракце, а таксама ў выпадку заключэння кантракта з работнікам, працоўны дагавор з якім быў заключаны на нявызначаны тэрмін. Такія гарантыі не распаўсюджваюцца на тых, хто працуе на сезоннай, часовай рабоце.

— Ці абавязаны работнік перадпенсійнага ўзросту па патрабаванні наймальніка праходзіць атэстацыю, пераатэстацыю, ці могуць яго адправіць на курсы павышэння кваліфікацыі?

Таццяна РАХУБА:

— Атэстацыі і пераатэстацыі не падлягаюць толькі цяжарныя жанчыны, жанчыны, якія выйшлі з водпуску па доглядзе дзіцяці (на працягу года) і маладыя спецыялісты. На ўсіх астатніх работнікаў нормы працоўнага заканадаўства распаўсюджваюцца ў поўным аб'ёме, у тым ліку і на работнікаў перадпенсійнага ўзросту.

Тое ж самае датычыцца і павышэння кваліфікацыі. Абмежаванняў па ўзросце ніякіх няма. Пакуль чалавек працуе, ён павінен павышаць сваю кваліфікацыю, тым больш што ёсць прафесіі, дзе практычна штогадовае павышэнне кваліфікацыі — гэта жыццёвая неабходнасць.

БЕСПРАЦОЎНЫ Ў ПЕРАДПЕНСІЙНЫМ УЗРОСЦЕ...

Ірына ШАЎЧЭНКА:

— У Законе «Аб занятасці» прапісаны дадатковыя гарантыі ў галіне садзейнічання занятасці. У прыватнасці, вызначаны катэгорыі грамадзян, якія маюць асаблівую патрэбу ў сацыяльнай абароне і няздольныя канкурыраваць на рынку працы на роўных умовах з іншымі. Гэта дзеці-сіроты, людзі з інваліднасцю, асобы, якія вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі, і ў тым ліку асобы перадпенсійнага ўзросту.

Ёсць прыклады, калі ў калектыўным дагаворы перадпенсійны ўзрост устанаўліваецца, скажам, за тры гады да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту.

Мясцовыя выканкамы ўстанаўліваюць бронь для пэўных катэгорый грамадзян, што маюць асаблівую патрэбу ў працы, у тым ліку і для асоб перадпенсійнага ўзросту. Прадпрыемствам прадпісваецца колькасць працоўных месцаў, на якія яны на працягу года, пры наяўнасці свабодных вакансій, павінны ўзяць у першую чаргу менавіта такія катэгорыі людзей. І, як правіла, арганізацыі імкнуцца гэтыя квоты выконваць.

У той жа час, калі б вы ведалі, як часта можна сутыкнуцца з нежаданнем вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю! Прыходзіць, дапусцім, у службу занятасці рабочы з 3-м разрадам. А новыя ўмовы вытворчасці патрабуюць, каб разрад быў не ніжэйшы за 5-ы. Але многія мужчыны ва ўзросце за 50 лічаць непатрэбным асвойваць новы, больш высокі разрад.

А колькі ў службу занятасці звяртаецца асоб, звольненых за прагулы? Наймальнік не хоча такіх браць на працу не таму, што яны ва ўзросце, а паколькі бачыць, што яны ненадзейныя работнікі. Многія проста не імкнуцца канкурыраваць на рынку працы. Але тады няхай не крыўдзяцца, што іх ніхто не хоча браць на работу.

Ніхто не можа абавязаць наймальніка ўзяць на працу чалавека, які яго не задавальняе як работнік, не падыходзіць па нейкіх крытэрыях. Пры разглядзе кандыдатуры на вакантнае працоўнае месца наймальнік мае права выбару работніка, паколькі ў першую чаргу ён нясе адказнасць за эфектыўнае функцыянаванне арганізацыі ў цэлым.

Ад нас самих залежыць вельмі многае. Сёння даволі нескладана атрымаць дадатковую адукацыю — перавучыцца, асвоіць новую прафесію, можна атрымаць практычна любую адукацыю дыстанцыйна. Можа, хтосьці ў гэтым узросце захоча перавучыцца на цырульніка або спецыяліста па манікюры і будзе пасля зарабляць больш, чым, напрыклад, раней, быўшы бухгалтарам...

Калі ёсць кваліфікацыя, дакументы аб асвоеных дадатковых уменнях і навыках, то спецыяліст і ў 50 гадоў можа быць цалкам канкурэнтаздольным.

Святлана БУСЬКО.

НАВУКА І ЖЫЦЦЁ

Развіталіся мы з правадным радыёвяшчаннем. Надоечы згледзеў непатрэбны рэпрадуктар і тут жа ўспомніў, як у шостым класе на ўроку фізікі настаўнік тлумачыў нам гукаправоднасць металаў, як прывёў досыць цікавы прыклад: калі, маўляў, што-небудзь сказаць перад сваім рэпрадуктарам у сваёй хаце, то гук па правадах дойдзе ў іншыя, і там яго можна будзе пачуць... Праўда — і па-першае — прыклаўшы вуха да такога ж рэпрадуктара, а па-другое — у той час, калі радыё не працуе...

Мы з хлопцамі тут жа скемілі, што на радыё вось такая прафілактычная гадзіна бывае, прычым кожны дзень і якраз пасля ўрокаў.

...Ледзь дачакаліся канца заняткаў — дружна разбегліся па дамах.

У нас у хаце нікога не было, таму я адразу ж заняў «пост» перад рэпрадуктарам. Пачакаўшы некалькі хвілін, пакуль дахаты дойдзе адзін з сяброў, я ва ўсё горла закрычаў: «Віцька-а-а!» З рэпрадуктара адразу ж данеслася: «Жэнька-а-а! Ура! Працуе! Праўда, гук слабаваты. Трэба мацней крычаць!» Я зароў што было сілы, і размова пайшла! Хутка да яе далучыліся іншыя галасы — куды слабейшыя...

Але ж раптам Віцькаў — сціх. Я, трохі пагалёкаўшы і не атрымаўшы адказу, выскачыў з хаты на вуліцу. Сябар быў ужо там, і я падумаў, што калі рваць свае глоткі так, як гэта рабілі мы, то ніякія рэпрадуктары, можа, і не патрэбны...

Віцька ж растлумачыў, што дома не заўважыў... бацькі, які раней прыйшоў з працы, — хацеў адпачыць, але ад крыку прахапіўся і, не сцяміўшы што да чаго, выгнаў нашчадка з хаты.

...Гэта, вядома ж, не адзінкавы прыклад, калі жыццё перашкаджала навуцы. Другі быў звязаны з заалогіяй.

У тым жа шостым класе настаўнік сказаў нам, што калі злавіць курыцу і, рэзка перавярнуўшы, пакласці яе на спіну, то птушка на некалькі секундаў нібыта засне.

Мы, як добрыя вучні, вырашылі праверыць гэта на канкрэтным доследзе. Пасля ўрокаў пайшлі ў хату да Віцькі (ён у нашай кампаніі быў завадатарам), узялі там ладны кавалак хлеба. Варта было вынесці яго ў двор і там пакрышыць, як да нас з усіх бакоў сталі збягацца чубаткі — дзяўбсці тыя крошкі.

На гэта мы і разлічвалі! Віцька, як гаспадар курэй, спрытна злавіў найбліжэйшую, рэзка перавярнуў яе і паклаў на спіну. Птушка, смешна тапырачы лапы, спакойна ляжала на зямлі. Значыць, ура? Праўду сказаў настаўнік!

Мы сталі святкаваць перамогу навукі: навыперадкі хапалі курэй, пераварочвалі іх, клалі на спіны. Бедныя нясушкі застывалі ў нерухомасці. Але ж не ўсе. А мы, не змаўляючыся, хацелі «паскладваць» усіх птушак, якія былі на Віцькавым падворку, што аказалася не так і проста, бо нейкія з курэй «засыналі», а другія ў гэты час ужо «прачыналіся» і пачыналі спакойна, як нічога ніякага, збіраць свае крошкі... Да таго ж, хоць і здалёку, на нас злосна кукарэкаў певень... А галоўнае, у самы разгар «эксперымента» з хаты выскачыла Віцькава маці і, добра агрэўшы нас ручніком па спінах, прагнала з двара.

Шкада было, бо свой «навуковы эксперымент» мы, на жаль, не завяршылі.

Яўген Шастакоў,

г. Гомель.

ЧАГО НЕ ЗРОБІШ, КАХАЮЧЫ...

Па тэлевізары неяк пачула, што адкрыўся новы касметычны салон: называецца «Метамарфоза».

І крэм аднайменны некалі быў, як Клава расказвала.

Працавала яна тады ў паляводчай брыгадзе: гэта значыць, з ранняй вясны і да самай восені на сонцы, на ветры, ад якіх і твар, і шыя, і рукі-ногі хутка рабіліся амаль што чорнымі. А вось астатняе цела — наадварот — заставалася белым.

Такі вось «калгасны» загар.

І яно б нічога: які ўжо ёсць, калі б напярэдадні мужу гэтай самай Клавы не далі пуцёўку на Чорнае мора, у санаторый.

Прыбрала яго жонка ва ўсё навюткае, адправіла адпачываць, а сама сабе думае: «Нагледзіцца ён там на аголеных, на дагледжаных, на гарадскіх — ад мяне, вось такой, дакладна адвернецца. Значыць, з загарам трэба нешта рабіць. А вось што?»

Суседчына дачка на выхадныя з Мінска прыехала. Клава да яе:

— Танечка, можа, ты ведаеш, чым загар мой звесці?

Тая *(смела):*

— А як жа, ведаю. Ёсць адзін крэм — намажашся ім і будзеш як новенькая! Можа, і сама сябе не пазнаеш! А ўжо муж...

Кажа так і тут жа прыносіць Клаве каробачку, не шкадуючы, плюхае ў яе ёду, старанна перамешвае. Усё — чароўны сродак гатовы.

Вечарам Клава стала ім мазацца: спачатку ногі і рукі, потым шыю... Адчувала, што пячэ, зараза, але ж, значыць, працуе! І калі трохі пацярпець...

Да донца, да апошняй грамулечкі крэм той цудадзейны выграбла, потым неяк заснула, а ранічкай глянула ў люстэрка...

Шчасце, што тая Танька з'ехала, а то магла б тут навекі застацца: скура ў Клавы што той бурак, тэмпература пад 38...

Карацей, на працу ў той дзень «прыгажуня» не пайшла. І назаўтра таксама... З тыдзень на людзі не выходзіла. Толькі потым пухіры сталі лопацца. А скура пад імі і сапраўды... бялейшая была!

Муж, прыехаўшы з санаторыя, гэта заўважыў і ацаніў. Аднак пра тую працэдуру, што зрабіла здуру, Клава яму нічога не сказала. Хай думае, што жонка ад самоты вось так зблажэла, ад перажыванняў. Можа, шанаваць больш будзе, па гаспадарцы памагаць.

І сапраўды падабрэў яе Віця. На палявыя работы Клаву болей не пусціў. Яна ў дзіцячы садок уладкавалася: памяняла матыку на швабру. А ўсё ж не на сонцы, ад якога так пакутуе наша жаночая прыгажосць.

Любоў Чыгрынава,

г. Мінск.

ЛАНДЫШЫ ПАХНУЦЬ ВЯСНОЙ

На дварэ тады быў май. І ў прыродзе, і ў жыцці ўсё віравала: мы заканчвалі 10 клас, сярэднюю школу, здавалі экзамены, строілі планы... Мы, хлопчыкі (не ведаю, як дзяўчаткі), адчувалі сябе дарослымі, дужымі і вельмі хацелі нешта зрабіць — ну такое, каб ахнулі ўсе: і настаўнікі, і бацькі, і нашы... каханыя. Былі такія.

...Не ў памяці, хто з нас першы сказаў пра ландышы, але ідэя спадабалася ўсім. На самай справе: хто ж адмовіцца ад гэтых пяшчотных, прыгожых, пахучых кветак?!

Мы тут жа распрацавалі план дзеянняў: дамовіліся з кіроўцам калгаснай машыны, што ён падвязе нас у вялікі бор. Гэта — за 10 вёрстаў, далекавата, але ж па чутках ландышы там дыванамі слаліся, іх было — хоць касою касі!

Мы выбралі брыгаду «касцоў».

І вось яна прыязджае. Кветак — бачым — і праўда, шмат. А ўжо водар ад іх...

Сталі збіраць. Шчыра скажу: не хлапечая, не мужчынская гэта справа — манатонная, марудная... І дзень пад вечар хіліцца.

Наш старэйшы таварыш, шафёр калгаснай машыны, кажа: «Хлопцы, давайце яшчэ ў адно месца матнёмся. Там гэтых кветак яшчэ больш можа быць».

Мы, вядома ж, за, бо нам... абы не збіраць.

Пакуль пераязджалі, на зямлю апускаўся змрок. Якія ўжо там ландышы?! А вось... веласіпеды, бачым, ляжаць. І некалькі мяшкоў пры іх...

Пашукалі вачыма гаспадароў — нідзе нікога нямашака. Зазірнулі ўнутр мяшкоў і вачам не паверылі: там былі... кветкі — ландышы! Нехта, мусіць, усёй сям'ёй ці нейкім кагалам збіраў іх, каб потым завезці на рынак, прадаць...

А мы ж усе камсамольцы! Мы ж такога не пацерпім: мы гэтым спекулянтам... аб'яўляем бой!

І таму, не змаўляючыся, закідваем у кузаў машыны два мяшкі з кветкамі і... па газах!

...У выніку бачылі б вы, які ў нас быў апошні званок! Якія букеты атрымалі нашы настаўнікі, нашы каханыя дзяўчаткі, матулі, бабулі, школьныя прыбіральшчыцы... Мы, хлопчыкі, былі ў той дзень сапраўднымі героямі, бо ўразілі ўсіх!

...Вось толькі ўспамінаць пра гэта мне па-ранейшаму сорамна.

Іван Гаральчук,

г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Маці схавала траіх малых дзяцей у шафе

Іх выявілі ратавальнікі, якія прыбылі па выкліку.

Паведамленне пра задымленне ў кватэры па вуліцы Казіміраўскай у Мінску паступіла ратавальнікам у 10.30. Калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, па знешніх прыкметах нічога не назіралася. Дзверы ў жыллё, дзе, як паведамлялася, быў дым, адчыніў гаспадар.

Як паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, на кухні ратавальнікі выявілі абгарэлую канапу. Са слоў гаспадара і яго жонкі, яны справіліся з узгараннем сваімі сіламі. Але на момант прыбыцця пажарных паралон мэблі яшчэ тлеў, а памяшканне знаходзілася ў антысанітарным стане. Ратавальнікі канчаткова ліквідавалі ўзгаранне, пры гэтым падчас абследавання кватэры заўважылі дзіцячыя рэчы. Муж і жонка адказалі, што ў іх чацвёра дзяцей, але ўсе яны знаходзяцца ў бабулі.

Пачуўшы шум у дзіцячым пакоі, у зачыненай шафе ратавальнікі ўбачылі траіх маленькіх дзяцей: хлопчыкаў 2008 і 2015 гадоў нараджэння і дзяўчынку 2012 года нараджэння. Спужаныя, яны сядзелі ў адной нішняй бялізне. Іх дасталі, супакоілі, накрылі коўдрай і агледзелі на прадмет самаадчування. Медыкі, якія прыбылі ў кватэру, далі заключэнне аб здавальняючым стане здароўя дзяцей. Па іх словах, у шафу іх пасадзіла маці, сказаўшы сядзець ціха і не рухацца.

На месца прыбылі і супрацоўнікі міліцыі, якія высвятляюць абставіны здарэння, а таксама прычыны, якія прымусілі дарослых паставіць жыцці дзяцей пад пагрозу. Устанаўліваецца і прычына пажару.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Неасабісты суб'ектыў

ЧЫСТЫ АБРУС

«Лепш за ўсіх» — гэта не пра ўсіх

З усіх дзяжурных і звычайных віншаванняў і пажаданняў на 8 Сакавіка (вясны ў душы, квітнець, быць маладой і каханай і г. д. і да т. п.), чутых у розных варыяцыях штогод, а ад таго, здаецца, не вельмі шчырых, на якія без эмоцый проста адказваеш дзяжурнае «дзякуй», мне сёлета пашанцавала атрымаць адно арыгінальнае. Чатырохгадовы Кастусёк, сын пляменніцы, стаміўшыся паўтараць усім шматлікім бабкам-цёткам пажаданні здароўя, шчасця, кахання і г. д., якім навучыла яго маці, мне па тэлефоне выдаў: «Жадаю, каб у цябе была новая прыгожая мэбля, а на стале ў кухні ляжаў такі абрус, які ніколі не пэцкаецца!» Мы з яго маці пасля доўга рагаталі, дзівіліся, якая ў малога практычна нацэленая фантазія, спрабавалі разгадаць, адкуль што ўзялося (я нават старалася ўспомніць: можа, тое дзіця і праўда бачыла ў мяне на стале запэцканы абрус?). Настрой ад гэткага неспадзяванага віншавання быў увесь вечар гарэзліва-жартаўлівым, нібы сама крыху здзяцінела. А пасля падумалася пра тое, што ўжо, напэўна, праз год, ну можа, праз два мы ад гэтага хлопчыка наўрад ці пачуем штосьці падобнае. Падросшы, ён ужо будзе дакладна выконваць правілы, і гаварыць толькі тое, што прынята ў той ці іншай сітуацыі...

Вось цікава: у які момант чалавек раз і назаўсёды страчвае сваю шчырасць і непасрэднасць, закладзеную ў ім пры нараджэнні? Калі ён пачынае разумець, што гаварыць тое, што думаеш, не заўсёды добра і можна? Дзе тая адпраўная кропка, калі пачынаеш станавіцца паўнапраўным членам грамадства — тыпова дзейнічаць, тыпова думаць, тыпова разважаць? Маючы ўсе шанцы, калі Бог не надзяліў эпатажнай смеласцю або адмысловым талентам, стаць правільным і сумным, як сілікатная цагліна?

ЗДАВАЛАСЯ б, менавіта сёння ад гэтай тыповасці нашы дзеці застрахаваныя як ніколі. Асабліва ў вялікіх гарадах столькі школ ранняга развіцця, столькі гурткоў, студый, якія прымаюць вучняў ледзь не з пялюшак. Яны наперабой абяцаюць выявіць у вашага дзіцяці здольнасці з самага ранняга ўзросту і развіць іх. Здавалася б, што можа быць лепш. І клапатлівыя бацькі, турбуючыся пра будучыню, вядуць ледзь не немаўлят у студыю, на кастынгі, на курсы. Якія зусім не бясплатныя. Ці не гэта прычына, што прымаюць туды амаль усіх? І тут яны становяцца рабамі прыдуманых стэрэатыпаў хутчэй, чым у любым іншым месцы. Бо ты не можаш быць неталенавітым, непаспяховым, неразумным. Ты павінен адпавядаць. Дзіўна назіраць, як дзяўчынка гадоў пяці стараецца ісці па вуліцы, як мадэль па подыуме, а хлопчык дашкольнага ўзросту, едучы ў метро, трымае ў руках кніжку на замежнай мове (усё б нічога, пакуль не ўбачыш выраз яго твару)...

Але ж не ўсім быць мадэлямі і дыпламатамі, не ўсім быць самымі лепшымі. Так не бывае. Толькі як растлумачыць гэта яшчэ зусім малым чалавекам, калі іх бацькоў (а бацькі пасля — іх) заточвалі менавіта на гэта? І праграма «Лепш за ўсіх!», якую рэтранслююць з расійскага канала, — не самая лепшая для выхавання нармальных дзяцей. Нагледзеўшыся на вундэркіндаў, сабраных з шостай часткі сушы, яшчэ больш і нашых мам-татаў кінуцца шукаць у сваіх дзетак адмысловыя таленты. Калі ж не атрымаецца — ёсць вялікая верагоднасць займець пакаленне запраграмаваных няўдачнікаў, якія пацярпелі фіяска ў раннім дзяцінстве і якія больш не маюць жадання адчуць штосьці падобнае.

І такіх ужо шмат. Знаёмая працуе выкладчыкам інфарматыкі ў сталічнай гімназіі. Расказвала нядаўна пра адзін цікавы парадокс, які назірае апошнія некалькі гадоў. За тую задачу, якую дзесяць гадоў назад сямікласнік з цяжкасцю, але рашыў бы ці хоць бы паспрабаваў гэта зрабіць, большасць сямікласнікаў сённяшніх нават не возьмуцца. І гэта пры тым, што гэтыя сённяшнія сямікласнікі сядзяць за камп'ютарам у разы больш, чым іх умоўныя папярэднікі, а размова ідзе, падкрэслю, пра задачу па інфарматыцы. І справа тут не ў тым, што нашы дзеці падурнелі. «Яны сталі вельмі баяцца памыліцца. Яны баяцца спрабаваць, ім трэба, каб адразу было дакладна і правільна», — тлумачыць паводзіны сваіх сённяшніх вучняў настаўніца з трыццацігадовым стажам.

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 883. Нумар падпісаны ў 19.30 9 сакавіка 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

10 сакавіка 2018 г. № 10 (443)

ТЭМА ТЫДНЯ

АД БЯСПЕКІ ДА ЯКАСЦІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як у краіне вырашаюцца пытанні пітнога водазабеспячэння

СЁННЯ цяжка ўявіць, што яшчэ ў пачатку 2000-х гадоў нават у буйных гарадах краіны існавалі праблемы з доступам да якаснай пітной вады, дзейнасцю ці ўвогуле наяўнасцю сістэм каналізацыі... У выніку рэалізацыі Дзяржпраграмы «Чыстая вада» многія з гэтых пытанняў калі не зніклі з парадку дня, то страцілі сваю злабадзённасць. Але наколькі паспяхова адбываецца гэты працэс?

ВАДА — ПАКАЗЧЫК ДАБРАБЫТУ

Спецыялісты сцвярджаюць: якасная пітная вада па сваіх арганалептычных уласцівасцях, мікрабіялагічным і хімічным саставе павінна адпавядаць санітарным нормам і правілам. Ад яе якасці залежыць стан здароўя насельніцтва, узровень санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту, ступень камфортнасці і, як следства, сацыяльная стабільнасць грамадства.

стар. 4

стар. 2

Што па сіле слабаму полу?

стар. 4,13

Ачышчальныя аб'екты пад кантроль аблвыканкамаў

стар. 16

Ёсць вуліцы Цэнтральныя...

СЕСІЯ

ФОРМА СА ЗМЕСТАМ

Дэпутаты Брэсцкага абласнога Савета падвялі вынікі работы 27-га склікання

У мінулую суботу дэпутаты папярэдняга складу сабраліся на форум, каб асэнсаваць пройдзенае, намеціць задачы, абазначыць праблемы, якія пераходзяць да новага складу. Тым больш што пэўная частка народных абраннікаў з цяперашняга Савета перайшлі ў новы.
Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Сяргей АШМЯНЦАЎ звярнуў асаблівую ўвагу на практыку выязных сесій.

Дэпутаты, на выезд!

Не толькі папярэдняе, але і тры мінулыя склікання аблсавет практыкаваў выязныя сесіі як найбольш аптымальную і наглядную форму вывучэння вопыту на месцах. Падчас выязнога форуму кожны народны абраннік мог пачуць цікавую для яго інфармацыю з першых вуснаў. За справаздачны перыяд такіх форумаў прайшло шэсць.

Выязная сесія ў Столінскім раёне на тэму прыцягнення ў абарот маёмасці, што не выкарыстоўваецца, стала школай найлепшага вопыту для многіх удзельнікаў. Як вядома, падобныя пытанні лепш вырашаюцца ў раёнах, якія размешчаны паблізу ад вялікіх гарадоў. Столін жа адзін з самых аддаленых ад цэнтра вобласці, а таксама ад сталіцы раёнаў, але мясцовыя органы ўлады працуюць даволі актыўна ў азначаным кірунку. Адно з памяшканняў былога ваеннага гарадка ў Давыд-Гарадку ператварылася пасля рамонту і рэканструкцыі ў дзіцячы садок. Месцаў у дашкольнай установе не хапала, і новы садок стаў вырашэннем сацыяльнай праблемы для многіх сем'яў.

стар. 3

Фота Аляксандра ШУЛЫГІНА.

Удзельнікі аднаго з форумаў наведваюць Стрыгаўскі Дом культуры.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

ПЕРАВАГА — ПРАМЫМ ЗАМЕЖНЫМ ІНВЕСТЫЦЫЯМ

Спікер верхняй палаты парламента ўзяў удзел у нарадзе

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў справаздачу ўрада, Нацыянальнага банка, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама аб выніках працы эканомікі за 2017 год і задачах па забеспячэнні ўстойлівага эканамічнага росту. У мерапрыемстве прыняў удзел і старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.

У сваім выступленні ён звярнуў увагу на шэраг ключавых пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця. Спікер закрануў тэму мадэрнізацыі прадпрыемстваў, падкрэсліўшы, што гэту работу неабходна праводзіць за кошт прыцягнення прамых замежных інвестыцый і даходаў ад публічнага размяшчэння акцый. Прамым замежным інвестыцыям варта аддаваць перавагу перад звязанымі крэдытамі пад гарантыі ўрада. Прадпрыемствы пакуль недастаткова займаюцца самастойным прыцягненнем фінансавых рэсурсаў, у тым ліку праз фондавы рынак. Гэтыя працэсы трэба актывізаваць, падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

БЕЛАРУСКУЮ ІНІЦЫЯТЫВУ ЎСПРЫНЯЛІ

Гэта адбылося на форуме ЕЭК ААН

Мар'яна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, узяла ўдзел у пасяджэнні сегмента высокага ўзроўню форуму ЕЭК ААН у Жэневе.

Падчас яго Мар'яна Шчоткіна прадставіла вопыт нашай краіны па дасягненні Мэт, а таксама вынікі праведзенага ў Мінску ў лютым Рэгіянальнага форуму нацыянальных каардынатараў па МУР. І галоўнае — ініцыятыва Беларусі па стварэнні глабальнай базы даных па дасягненні Мэт устойлівага развіцця была падтрымана на форуме.

Удзельнікі пасяджэння з цікавасцю ўспрынялі інфармацыю пра Беларусь. Прагучалі пытанні, якія датычацца фарміравання беларускай архітэктуры кіравання працэсам дасягнення Мэт. Акрамя таго, замежныя эксперты цікавіліся, як па гэтых пытаннях пабудавана ўзаемадзеянне з прадстаўнікамі бізнесу і грамадзянскай супольнасці. Мар'яна Шчоткіна таксама праінфармавала аб агучаных на мінскім форуме прапановах па пабудове партнёрскай сеткі нацыянальных каардынатараў па МУР. Гэтыя прапановы былі падтрыманы.

РАЗВІВАЕМ ЭЛЕКТРАТРАНСПАРТ

Сенатар абмеркаваў магчымасць паляпшэння гэтай сферы

Член Прэзідыума Савета Рэспублікі Сяргей Рахманаў сустрэўся з прадстаўнікамі бізнесу для абмеркавання перспектыў вытворчасці электратранспарту. Так, праект «Развіццё рынку электрычных транспартных паслуг» плануецца рэалізаваць у тэхналагічным парку «Магілёў» з удзелам БНБ-Банка і нямецкай кампаніі COWI.

Сяргей Рахманаў, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, адзначыў, што Беларусь зацікаўлена ў развіцці рынку электратранспарту і для гэтага ствараюцца неабходныя ўмовы. Паспяхова наладжаны выпуск айчыннага электробуса, які запатрабаваны як на знешнім рынку, так і за мяжой. Пры садзейнічанні кітайскіх экспертаў беларускія навукоўцы распрацавалі першы айчынны электрамабіль. Работы вядуцца і ў галіне вытворчасці гібрыднага аўтатранспарту. Будаўніцтва ў Беларусі атамнай станцыі будзе садзейнічаць пераходу на гарадскі электратранспарт, што палепшыць стан паветра.

«Для нас сёння важна ўзмацніць міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне вытворчасці электратранспарту, і мы гатовыя разглядаць розныя варыянты, — падкрэсліў Сяргей Рахманаў. — Думаю, у гэтай галіне ў нас добрыя перспектывы, асабліва з улікам магчымасці экспарту прадукцыі на рынкі краін ЕАЭС, у першую чаргу Расійскай Федэрацыі».

Вераніка ПУСТАВІТ.

НА ПЕРСПЕКТЫВУ

Беларусь — Ізраіль: узаемавыгаднае супрацоўніцтва

Беларуска-ізраільскія адносіны павінны выйсці на якасна новы ўзровень развіцця. Пра гэта гаварылася падчас нядаўняга візіту беларускай парламенцкай дэлегацыі на чале са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Папковым у Дзяржаву Ізраіль.

У першую чаргу трэба будзе пашырыць супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай сферы. Нягледзячы на тое, што ў апошнія гады намецілася пазітыўныя тэндэнцыі ўзаемнага гандлю: у 2017-м яго рост дасягнуў 150 %, а беларускі экспарт у Ізраіль павялічыўся на 70 % у параўнанні з папярэднім годам. Тут, на думку спецыялістаў, ёсць яшчэ шмат нявыкарыстаных магчымасцяў.

Члены беларускай парламенцкай дэлегацыі сустрэліся са спікерам Кнесета Ізраіля Юліем Эдэльштэйнам і генеральным дырэктарам Альбертам Сахаровічам. Падчас перагавораў з дэлегацыяй Лігі міжпарламенцкай дружбы «Ізраіль—Беларусь» на чале з яе кіраўніком, віцэ-спікерам Кнесета Талі Пласкоў, а таксама з міністрам алії і інтэграцыі Ізраіля, сустаршынёй сумеснага беларуска-ізраільскага камітэта па гандлёвым і эканамічным супрацоўніцтве Софай Ландвер члены беларускай дэлегацыі абмеркавалі ступень парламенцкага ўдзелу ў прасоўванні перспектыўных праектаў беларуска-ізраільскага супрацоўніцтва.

На думку кіраўніка рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентам Дзяржавы Ізраіль Аляксандра Папкова, Ізраіль можа стаць найважнейшым інвестыцыйным партнёрам для нашай краіны ў частцы актывізацыі кааперацыі дзвюх дзяржаў у галіне IT-тэхналогій. У цяперашні момант нямала ізраільскіх кампаній уваходзіць у беларускі Парк высокіх тэхналогій. Вялікія перспектывы інвестыцыйнага супрацоўніцтва і ў аграпрамысловай вытворчасці. «Патэнцыял груп міжпарламенцкай дружбы вельмі вялікі, і яго трэба выкарыстоўваць у рэалізацыі канкрэтных сумесных праектаў у гандлёва-эканамічнай, інвестыцыйнай, турыстычнай, культурна-гуманітарнай і адукацыйнай сферах, — падкрэсліў парламентарый. — Беларусь гатова пастаўляць у Ізраіль прадукты харчавання, тэхніку. У свой час ізраільскі бізнес праявіў цікавасць да работы беларускіх сельгаспрадпрыемстваў. Узаемавыгадным для абедзвюх краін можа стаць праект па стварэнні сумесных вытворчасцяў. Таксама зараз у нашай краіне актуальная праблема энергазберажэння ў АПК. Беларускім аграрыям цікавы вопыт ізраільскіх калег як у гэтай сферы, так і ў частцы перапрацоўкі адходаў сельскагаспадарчай вытворчасці».

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь дзейнічаюць 153 юрыдычныя асобы з ізраільскім капіталам. З дапамогай ізраільскіх інвестараў у Мінскай вобласці рэалізаваны ўнікальны для краін СНД высокатэхналагічны цэнтр збору і перапрацоўкі адпрацаваных машынных маслаў. Таксама ў рамках беларуска-ізраільскага ўзаемадзеяння разглядаюцца пытанні прыцягнення беларускіх будаўнікоў для работы на аб'ектах у Ізраілі і стварэння ў Беларусі ізраільскага навучальнага цэнтра, дзе будзе праводзіцца адбор і навучанне беларускіх спецыялістаў рабочых спецыяльнасцяў.

Па выніках праведзеных перагавораў, у мэтах прасоўвання беларускай прадукцыі на рынак Ізраіля Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь прапанавана абмеркаваць — з запрашэннем прадстаўнікоў найбуйнейшых ізраільскіх кампаній — перспектывы беларуска-ізраільскага супрацоўніцтва ў жывёлагадоўчай і іншых галінах сельскай гаспадаркі. Таксама разгледзець магчымасці ўдзелу беларускіх прадпрыемстваў у 20-й Міжнароднай выстаўцы «Agritech Israel — 2018», якая адбудзецца сёлета ў маі ў Тэль-Авіве.

Вялікія перспектывы ў беларуска-ізраільскага супрацоўніцтва і ў сферы развіцця турызму, у тым ліку аздараўленчага. Беларускі бок гатовы разглядаць інвестыцыйныя прапановы па стварэнні сумеснага цэнтра па аздараўленні на базе адной з абласцей нашай краіны.

Падчас візіту беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Ізраіль шырока абмяркоўвалася і тэматыка малой радзімы, якая цікавіць большасць выхадцаў з Беларусі. Аляксандр Папкоў заклікаў ізраільцян, якія маюць беларускія карані, актыўна ўдзельнічаць у рэалізацыі праектаў па захаванні месцаў гістарычнай памяці, якіх сёння нямала ў нашай краіне.

Плануецца, што ўсе прапановы па пашырэнні ўзаемадзеяння абедзвюх краін, выказаныя падчас перагавораў беларускіх і ізраільскіх парламентарыяў, будуць абмеркаваны на чарговым пасяджэнні сумеснага беларуска-ізраільскага камітэта па гандлёвым і эканамічным супрацоўніцтве, якое запланавана правесці ў маі 2018 года.

Наталля БІТЭЛЬ.

І ЖАРТАМ, І ЎСУР'ЁЗ

ПАРТФЕЛЬ ПА СІЛЕ

Па выніках выбараў у мясцовыя Саветы амаль палову дэпутацкіх партфеляў ускінулі на свае плечы жанчыны. Большасць прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва працуюць на месцах — у сельскіх і пасялковых Саветах дэпутатаў. Яны, можна сказаць, твар у твар сутыкаюцца з надзённымі праблемамі грамадзян. У гэтыя святочныя дні мы звярнуліся да жанчын-дэпутатаў, каб пацікавіцца, якія «нежаночыя» праблемы ім даводзіцца вырашаць?

Ірына КРЫКСІНА, старшыня Верамейскага сельскага Савета дэпутатаў Чэрыкаўскага раёна:

— Грамадзяне звяртаюцца па разнастайных пытаннях, таму прыходзіцца займацца і «нежаночымі» справамі. Дзесьці ў камунальнікаў рукі не дайшлі — дапамагаем. Калі пачынаецца сезон добраўпарадкавання мясцовасці, магу самастойна і плот адрамантаваць. Пачаўся снегапад — адразу бяру ў рукі лапату і прыбіраю. У маім распараджэнні машына «Жыгулі», прычэп да яе. Прывожу куды трэба косы, бензапілы і іншы інвентар. Акрамя дэпутацкай пасады, я ж яшчэ і старшыня сельвыканкама. Заўсёды выконваю свае абавязкі самастойна, не прывыкла чакаць дапамогі.

Наталля ШОСЦІК, старшыня Рэчыцкага сельскага Савета дэпутатаў Камянецкага раёна:

— Сярод «нежаночых» спраў у асноўным пытанні добраўпарадкавання — ліквідацыя звалак, арганізацыя насельніцтва на збор смецця. Мне даводзіцца вырашаць праблемы скошвання раслінасці ў грамадскіх месцах, выдалення аварыйных дрэваў — пэўныя цяжкасці выклікаюць у мяне мерапрыемствы толькі такога кшталту. Усё астатняе жанчынам па сіле.

Вольга АРЦЁМЕНКА, дэпутат Віцебскага раённага Савета:

— Мне прыходзілася вырашаць пытанні будаўніцтва аграгарадка Кіраўская і капітальнага рамонту школы ў гэтым пасёлку. Рамонт, увогуле, не жаночая справа. Я ўнікала ва ўсе будаўнічыя моманты, кіравала рабочымі, падпісвала дакументы... Мы перажылі будаўніцтва стадыёна для нашай школы. Педагагічны калектыў сваімі жаночымі рукамі ствараў гэтую спартыўную пляцоўку. Мы самастойна граблі зямлю, капалі, добраўпарадкавалі, засыпалі тэрыторыю камянямі там, дзе гэта было патрэбна...

Нэлі ГАМБАРАН, старшыня Лукомльскага сельскага Савета дэпутатаў Чашніцкага раёна:

— У маёй рабоце шмат пытанняў, звязаных з тэхнікай. Як кіраўнік сельвыканкама я ваджу аўто. Вядома, у наш час гэта звычайная справа, але ёсць і цяжкасці — машына новая, электроніка складаная... Даводзіцца мне вырашаць пытанні і з дарожным будаўніцтвам. А яшчэ я павінна ведаць, якія агрэгаты заказаць для расчысткі дарог і іншых патрэб. Неабходна разбірацца ў тэхніцы: магутнасці, магчымасцях і іншых характарыстыках прылад. На мой погляд, гэта «нежаночыя» пытанні. Каб справіцца з цяжкасцямі, чытаю літаратуру, карыстаюся крыніцамі з інтэрнэту.

Алена ГАНЕВІЧ, дэпутат Гродзенскага абласнога Савета:

— У нас кампетэнцыя пытанняў вельмі шырокая. «Нежаночыя», на мой погляд, — гэта справы, звязаныя з будаўніцтвам. За час майго дэпутацтва будавалася школа, дом сямейнага тыпу, праводзілася рэканструкцыя Воранаўскай школы. Кожны год спраўляемся з такімі маштабнымі задачамі. Да гэтага трэба дадаць яшчэ і бягучыя справы па рамонце і аднаўленні адукацыйных устаноў рэгіёна. З цяжкасцямі дапамагаюць разабрацца кампетэнтныя людзі. З пэўнымі нюансамі знаёмлюся, дзякуючы літаратуры. Але самы паспяховы вопыт — гэта практыка. Калі будаваліся школы, я амаль кожны дзень наведвала аб'екты. Сустрэчы з кіраўніцтвам будаўнічых арганізацый, штабныя планёркі, якія мы праводзілі, далі магчымасць разабрацца ў гэтых пытаннях.

Марыя ДАДАЛКА.

«Прыслухаемся да ўсіх пажаданняў»

Адбылася першая сесія Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў 28-га склікання

У сталічны орган мясцовага самакіравання абрана 57 чалавек. На парадак дня было вынесена сем пытанняў, у ліку якіх — зацвярджэнне структуры Савета і складу пастаянных камісій, абранне старшыні і намеснікаў старшыні Савета, старшыняў пастаянных камісій, прэзідыума.

Прысутны на сесіі **старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ** у першую чаргу выказаў падзяку дэпутатам 27-га склікання. Бо за час іх плённай работы ў сталіцы было пабудавана 17 дзіцячых садкоў, чатыры школы на 1 020 месцаў кожная, чатыры паліклінікі, дзве амбулаторыі. Адкрыты стадыён на вуліцы Каржанеўскага і парк экстрэмальных відаў спорту. Прынята праграма будаўніцтва басейнаў крокавай даступнасці, хутка будуць здадзены ў эксплуатацыю абноўлены стадыён «Дынама» і новы цэнтр мастацкай гімнастыкі. Кіраўнік горада выказаў надзею на паспяховае супрацоўніцтва гарадскіх уладаў і з дэпутатамі 28-га склікання.

Павіншавала абраннікаў народа з новай адказнай місіяй **старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА**, якая падкрэсліла, што Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў — самы прэстыжны з мясцовых, бо ён сталічны:

— Вы абраныя падчас жорсткай канкурэнтнай барацьбы, на ваша месца прэтэндавалі іншыя. Хачу пажадаць, каб Савет на працягу чатырох гадоў паспяхова працаваў, каб кожны выбаршчык Мінска мог сказаць: «Я задаволены сваім выбарам, я ганаруся сваім дэпутатам».

Старшынёй Мінгарсавета быў абраны Васіль Панасюк, які прадстаўляе Матусевіцкую выбарчую акругу. Для дэпутата гэта ўжо пятае скліканне, прычым на працягу двух апошніх ён ужо ўзначальваў Мінскі гарсавет. Намеснікамі старшыні сталі Сяргей Хільман і Вольга Смірнова.

Падчас сесіі былі створаны дзевяць пастаянных камісій гарсавета: па галоснасці, самакіраванні і правапарадку; па эканамічным развіцці, фінансах і бюджэце; па горадабудаўніцтве, жыллёвай палітыцы, землекарыстанні і экалогіі; па гарадской гаспадарцы, транспарце і сувязі; па кіраванні і распараджэнні камунальнай уласнасцю; па спажывецкім рынку, прадпрымальніцтве і рэкламе; па ахове здароўя і сацыяльнай абароне; па адукацыі, навуцы, культуры і спорце; па сувязі з грамадскімі арганізацыямі, маладзёжнай палітыцы, міжнароднай дзейнасці.

— Мы будзем прыслухоўвацца да ўсіх пажаданняў, якія выказвалі нашы выбаршчыкі.

Гэта паўсядзённая і карпатлівая праца. Вядома ж, неабходна больш увагі ўдзяляць добраўпарадкаванню дваровых тэрыторый, арганізацыі дадатковых парковак, сацыяльнай інфраструктуры, у тым ліку дзіцячым садкам і школам, капітальнаму рамонту жылога фонду, а таксама стварэнню новых працоўных месцаў і павелічэнню самазанятасці, — адзначыў **старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Васіль ПАНАСЮК.**

Дар'я КАСКО.

ФОРМА СА ЗМЕСТАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Таксама цікавы прыклад убачылі дэпутаты на тэрыторыі Белавушскага сельсавета. Будынак былога магазіна, які даўно быў закрыты, пераабсталявалі пад банкетную залу. У гэтых мясцінах населеныя пункты вялікія, на вяселле збіраюцца сотні людзей. А правесці яго раней не было дзе, звычайна бацькі маладых узводзілі нешта накшталт шатра. Але ж у халоднае надвор'е ўзнікалі праблемы. Цяпер жа людзі могуць заплаціць невялікую арэндную плату і праводзіць сваё мерапрыемства ў зручным і прыстасаваным памяшканні. Многіх удзельнікаў сесіі гэта зацікавіла.

Добрыя ўспаміны ў іх пакінула выязная сесія ў **Іванаўскім раёне** — па пытаннях захавання культурнай спадчыны. Іванаўшчына была выбрана для дэпутацкага форуму невыпадкова. Там шмат славутасцяў і мясцін, звязаных з жыццём і дзейнасцю вядомых людзей. Несумненна, землякі ганарацца адноўленай сядзібай Напалеона Орды ў Варацэвічах. Менавіта яго карціны, малюнкі і накіды старадаўняй архітэктуры зрабілі магчымым аднаўленне ці хоць бы захаванне памяці пра сядзібы і палацы як беларускай, так і суседніх зямель. Сёння ў Варацэвічах размешчаны музей мастака. Цікавай мясцінай уяўляецца і Дастоева, радзіма продкаў Фёдара Дастаеўскага. Зараз усё больш прадметна вядзецца размова аб аднаўленні сядзібы за сродкі Саюзнай дзяржавы. Усю разнастайную спадчыну падтрымліваюць, аберагаюць, захоўваюць работнікі культурнай галіны. З імі і сустракаліся дэпутаты абласнога Савета, з імі абмяркоўвалі магчымыя шляхі развіцця музейнай справы, народных рамёстваў, мастацкай самадзейнасці на карысць пашырэння ўязнога турызму, а таксама выкарыстання багатай спадчыны продкаў у справе патрыятычнага выхавання маладога пакалення.

Галоўным чынам на выхаванне была накіраваная сесія па пытаннях навучання насельніцтва бяспецы жыццядзейнасці. Сесія праходзіла на тэрыторыі Камянюцкага сельсавета Камянецкага раёна. На форуме прысутнічаў міністр МНС Уладзімір Вашчанка. Дэпутатам і шматлікім удзельнікам сесіі было паказана, як праходзіць навучанне ўсіх катэгорый насельніцтва, пачынаючы з дзіцячага садка. Абмеркаванні ўзнікалі на кожным этапе, дэпутаты не чакалі пленарнага пасяджэння. Многія з удзельнікаў гаварылі, што можна пераняць, укараніць у сябе. Сесія прайшла з карысцю і для ўдзельнікаў, і для тых, хто выступіў прымаючым бокам. Яны рыхтаваліся, нешта палепшылі, удасканалілі ў сваёй рабоце. Таму выязныя сесіі, прэзідыумы таксама ідуць на карысць рэгіёнам, адзначылі дэпутаты.

Аляксандр САЎЧЫЦ.

Аляксандр КАРПІЦКІ.

Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Канстанцін ШАРШУНОВІЧ.

Ці ўсё ў парадку?

Добраўпарадкаванне было адной з асноўных тэм на працягу ўсяго папярэдняга склікання. Агляды чысціні і парадку ў населеных пунктах праходзілі не толькі перад сесіяй альбо пасяджэннем прэзідыума. Кожны год аблсавет праводзіў конкурс на самае лепшае добраўпарадкаванне населеных пунктаў, а таксама конкурсы старастаў вёсак. І, вядома ж, перамагаў той са старастаў, у якога вёска выглядала найбольш прывабна.

Летась наша газета расказвала аб адной з пераможцаў абласнога конкурсу старасце вёскі Падкраічы Бярозаўскага раёна Таісе Чапайле. Гэта сапраўдны вясковы лідар. На яе рахунку ўзвядзенне і ўладкаванне альтанак, добраўпарадкаванне парку, аснашчэнне яго малымі архітэктурнымі формамі. Таіса Васілеўна жыхароў цэлых вуліц арганізоўвала на суботнікі, дзе ўсе разам паляпшалі знешні выгляд свайго населенага пункта. А грошы, законную прэмію, якую яна атрымала за перамогу ў конкурсе, Таіса Чапайла патраціла на грамадскія патрэбы.

І такіх старастаў ці іншых грамадскіх актывістаў, на шчасце, не мала. Рознымі прэміямі і дыпломамі адзначаліся дамавыя камітэты з Баранавічаў, Брэста, Пінска. У Баранавічах вядомасць атрымаў камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Надзея», які аб'яднаў 25 дамоў. На яго ўзор утвораны іншыя камітэты: «Сонечны», «Вясёлкавы», «Дамавічкі»... Некаторыя ініцыятыўныя жыльцы не афармлялі арганізацыйна свой орган дамавога самакіравання, але здолелі так паставіць справу, што поспехаў дабіліся несумненных. Такімі рупліўцамі можна назваць жыльцоў дома № 2 па вуліцы Чыгуначнай. Дом, якому больш за сто гадоў, яны зрабілі тэрыторыяй узорнага парадку. І былі ўзнагароджаны дыпломам, а таксама прэміяй аблсавета, за якую набылі касілку для добраўпарадкавання двара.

> Іх вопыт таксама вывучалі і абагульнялі дэпутаты. Асабліва важна працягваць гэтую работу, напаўняць яе новым зместам сёлета, у Год малой радзімы, ды і ўсе наступныя гады, падкрэслівалася на сесіі.

Падзякі — найлепшым

На выніковай сесіі падзякавалі за работу ўсім дэпутатам, і асабліва тым, хто адпрацаваў не адно, а два, тры і больш скліканняў. Сярод іх **Аляксандр САЎЧЫЦ, генеральны дырэктар ААТ «Савушкін прадукт»**. Прадпрыемства, якое ён узначальвае, адно з найлепшых у малочнай галіне краіны. Летась калектыву названага прадпрыемства прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь.

Іван ТУРЧАК, дэпутат па Баранавіцкай акрузе, узначальвае Баранавіцкае баваўнянае аб'яднанне, адзін з найбуйнейшых камбінатаў па вытворчасці тэкстылю не толькі ў Беларусі, але і ў СНД, у Еўропе. Сярод паспяховых кіраўнікоў-дэпутатаў называлі і **Таццяну ДЗЕМІДЗЮК, старшыню СВК «Узыходзячая зара» Кобрынскага раёна, Міхаіла СТРАПКО, дырэктара ААТ «Відамлянскае» Камянецкага раёна.** Чатыры скліканні адпрацаваў **Канстанцін ШАРШУНОВІЧ, начальнік абласнога ўпраўлення МНС.**

Галоўны ўрач Брэсцкай абласной бальніцы, **доктар медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр КАРПІЦКІ** таксама чатыры разы атрымліваў давер выбаршчыкаў. Пад яго кіраўніцтвам абласная бальніца стала клінікай рэспубліканскага ўзроўню, навукова-практычным цэнтрам, дзе праводзяцца складаныя аперацыі на сэрцы, робіцца перасадка ўнутраных органаў. І ўвесь час Аляксандр Карпіцкі ўзначальваў дэпутацкую камісію па сацыяльна-культурнай сферы і сацыяльнай абароне насельніцтва.

На думку Сяргея Ашмянцава, абсалютная большасць дэпутатаў абласнога Савета ў мінулым скліканні, як і ў папярэдніх, да сваёй работы ставілася адказна. А новаму складу Савета цяпер ужо былыя народныя абраннікі пажадалі больш плённа працаваць з насельніцтвам, з выбаршчыкамі ў сваіх акругах.

* * *

6 сакавіка адбылася першая сесія Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання. Яго **старшынёй абраны Юрый НАРКЕВІЧ**. Да гэтага Юрый Іосіфавіч працаваў кіраўніком спраў Брэсцкага аблвыканкама. Яшчэ раней больш за дзесяцігоддзе ўзначальваў Бярозаўскі райвыканкам. Яго намеснікам стала **Валянціна ПУХ, дырэктар абласнога філіяла РУП «Белпошта».**

Святлана ЯСКЕВІЧ.

АД БЯСПЕКІ ДА ЯКАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

За чысцінёй і бяспекай пітной вады сочаць акрэдытаваныя лабараторыі арганізацый вода-каналізацыйнай гаспадаркі і лабараторыі санітарных службаў.

З 2002 года ў краіне рэалізавана некалькі этапаў Дзяржаўнай праграмы па водазабеспячэнні і водаадвядзенні «Чыстая вада». Сёння работа ў гэтым кірунку працягваецца з дапамогай аднайменнай падпраграмы дзяржпраграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2016–2020 гады.

Як расказала **начальнік управ-ления камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Марына ТОЎСЦІК**, да канца 2020 года неабходна дасягнуць паказчыка забяспечанасці пітной вадой нарматыўнай якасці 100 % спажыўцоў, якія маюць доступ да цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння. За 2017 год гэты паказчык склаў 87,1 %.

Але і сёння, без запланаваных мерапрыемстваў, нашу ваду нельга назваць няякаснай і небяспечнай. Па звестках Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, вынікі лабараторных даследаванняў апошніх 10 гадоў фіксуюць стабілізацыю на ўзроўні менш за 1 % проб пітной вады з водаправоднай сеткі, якія не адпавядаюць гігіенічным нарматывам па мікрабіялагічных паказчыках. Пры гэтым, паводле рэкамендацый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, вада лічыцца бяспечнай у эпідэміялагічных адносінах, калі колькасць такіх проб не перавышае 5 %.

ПРАБЛЕМА НУМАР АДЗІН

Калі шкодных мікраарганізмаў у беларускай вадзе сустракаецца вельмі мала, то такога хімічнага элемента, як жалеза, у ёй звыш нормы. Па даных Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, каля 40 % ад усіх свідравін падаюць ваду з колькасцю жалеза, большай за гранічна дапушчальную канцэнтрацыю. Асабліва насычаная ім вада на Палессі.

> Перыядычна ў дзяржаўныя органы і СМІ паступаюць скаргі грамадзян з розных рэгіёнаў Беларусі на якасць вады і яе руды колер. Але гэтыя выпадкі, кажа Марына Тоўсцік, не сістэмныя і звязаныя, перш за ўсё, з аварыйнымі сітуацыямі на трубаправодах. Нельга таксама выключаць і фактар узросту некаторых участкаў водаправоднай сеткі.

Пры гэтым, па словах спецыяліста, усе мерапрыемствы, неабходныя для падачы якаснай вады спажыўцам: прамыўка вонкавых і ўнутраных водаправодных сетак, дэзынфекцыя і іншыя — праводзяцца прадпрыемствамі, якія абслугоўваюць водаправоды, згодна з патрабаваннямі.

Галоўны ўпор у вырашэнні праблемы «жалезнай» вады камунальнікі ўсё ж робяць на будаўніцтве станцый абезжалезвання. Сёння прадпрыемствамі, што ўваходзяць у сістэму ЖКГ, эксплуатуецца 598 станцый абезжалезвання вады. А да 2020 года, падчас рэалізацыі падпраграмы «Чыстая вада», у Беларусі плануецца пабудаваць яшчэ каля 500 такіх аб'ектаў.

— Каб выканаць такую маштабную задачу, неабходна ўкласці шмат сродкаў, таму для фінансавання будаўніцтва станцый, акрамя сродкаў мясцовых і рэспубліканскага бюджэтаў, шукаюцца розныя крыніцы, — расказвае Марына Тоўсцік. — Так, напрыклад, цяпер прапрацоўваецца пытанне з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця аб выдзяленні крэдытных грашовых сродкаў у памеры 15 млн еўра на будаўніцтва 80 станцый абезжалезвання ў Віцебскай вобласці.

Дасягнута таксама дамоўленасць з Сусветным і Еўрапейскім інвестыцыйным банкамі аб фінансаванні праектаў у сферы водазабеспячэння і водаадвядзення на суму 140 млн долараў.

КАЛОДЗЕЖ, ДАЙ ВАДЫ!

Сёння цэнтралізаванае водазабеспячэнне маюць 98,5 % гарадскога насельніцтва і 66 % сельскага. У некаторых сельскіх населеных пунктах адсутнічаюць сістэмы цэнтралізаванага водазабеспячэння. На хутарах і ў невялікіх вёсках галоўнымі крыніцамі пітной вады па-ранейшаму застаюцца шахтавыя калодзежы і дробнатрубчастыя свідравіны. Акрамя таго, у апошнія гады многія сельскія жыхары бураць на сваіх участках індывідуальныя свідравіны. Але наколькі гэтыя спосабы атрымання вады эфектыўныя і бяспечныя?

Згодна з заканадаўствам для атрымання вады з неглыбокай свідравіны (да 20 м) не трэба звяртацца да кампетэнтных органаў па дазвол. Дастаткова замовіць работу па бурэнні свідравіны на ваду са спецыялізаванымі сертыфікаванымі арганізацыямі. Пры гэтым здабыча вады з такой свідравіны для фізічных асоб сёння бясплатная.

> **Юрый ДАРАГАКУПЕЦ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыня Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве:**
>
> — Беларусь займае адно з першых месцаў у Еўропе па запасах і паказчыках якасці пітной вады. І гэта дасягненне — вынік значнай работы, якая праводзіцца ў нашай краіне ў апошнія гады. Спажыўцы п'юць бясшкодную ваду, але перад намі стаіць задача зрабіць яе яшчэ больш якаснай (да другога чытання рыхтуецца праект Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях пітнога забеспячэння» — **Аўт.**).
>
> Неабходна таксама звярнуць увагу і на такую праблему: літаральна за апошнія 15 гадоў хімічны састаў каналізацыйных сцёкаў змяніўся, стаў больш агрэсіўны. У выніку ў крыніцы вады трапляюць розныя рэчывы, якія цяжка выдаліць звычайнымі спосабамі ачысткі. Упэўнены, што ў найбліжэйшы час трэба працаваць над змяншэннем шкоднага ўплыву «хіміі» на прыроду і здароўе людзей.

Але і тут ёсць свае нюансы. Па словах **начальніка ўпраўлення па геалогіі Мінпрыроды Васіля КОЛБА**, калі вады выкарыстоўваецца звыш 5 м³ у суткі, неабходна атрымаць дазвол на спецыяльнае водакарыстанне ў тэрытарыяльных органах Мінпрыроды. А садаводчыя таварыствы, якія ўстанаўліваюць на свідравіну лічыльнікі вады, павінны аплачваць яе спажыванне.

Нягледзячы на шматлікія плюсы, пры выкарыстанні вады са свідравін і калодзежаў не трэба забываць пра юрыдычныя аспекты і... уласную бяспеку. Здараюцца выпадкі, калі арганізацыі, якія займаюцца бурэннем водазаборных свідравін, не выдаюць уласнікам пашпарты на гэтыя аб'екты. У выніку дзейнасці такіх «спецыялістаў» людзі не ведаюць, якой глыбіні і магутнасці іх свідравіна, ці ўстаноўлены на ёй неабходныя фільтры і г. д., што можа прывесці да «знікнення» вады, забруджвання навакольля і нават праблем са здароўем. Апошнія, дарэчы, могуць узнікнуць і пры карыстанні ўжо дзеючымі калодзежамі.

Сёння дзяржаўны санітарны нагляд ажыццяўляецца за грамадскімі крыніцамі нецэнтралізаванага водазабеспячэння. За чысцінёй і якасцю вады ў індывідуальных калодзежах і калонках павінны сачыць іх уласнікі, што не заўсёды адбываецца своечасова і эфектыўна.

Пры гэтым такія крыніцы пітной вады — самыя ненадзейныя ў гігіенічным плане. Паколькі вада з іх знаходзіцца дастаткова блізка ад паверхні, на яе склад уплываюць многія фактары: ападкі, тэхнічны стан калодзежаў і калонак, а таксама размешчаныя побач жывёлагадоўчыя комплексы, склады ўгнаенняў, прыбіральні і нават агароды. У выніку падземныя воды могуць забрудзіцца шкоднымі для чалавека рэчывамі, у тым ліку нітратамі.

> Спецыялісты раяць: каб быць упэўненым у якасці вады ва ўласным калодзежы, неабходна прыкладна раз у год правяраць яе ў спецыялізаваных лабараторыях, а таксама перыядычна чысціць калодзеж і ўмацоўваць яго сценкі і дах.

Вераніка КОЛАСАВА

РАСКЛАД НА ЗАЎТРА

ЧЫСТАЯ ВАДА

РЭКАНСТРУЯВАЦЬ 7 і ўзвесці 17 ачышчальных збудаванняў каналізацыі плануецца сёлета ў Беларусі. (Да 2025 года ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы краіны, як мяркуецца, адновяць 38 такіх канструкцый. Пры гэтым для нармальнай работы галіны неабходна ўзвесці 114 ачышчальных збудаванняў па ўсёй краіне.)

Пра гэта паведаміў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр ЦЕРАХАЎ, які лічыць, што работы на аб'ектах, якія плануецца скончыць сёлета да верасня, аблвыканкамам трэба ўзяць пад уласны кантроль. Дзе будуць рэалізаваны і распачаты інвест-праекты, высвятляла наш карэспандэнт.

Брэсцкая вобласць

Самы вялікі аб'ект рэканструкцыі ў водаправодна-каналізацыйнай гаспадарцы Брэсцкай вобласці, работы над якім вядуцца з прыцягненнем крэдытных сродкаў, — гарадскія ачышчальныя збудаванні Брэста. Іх мяркуюць скончыць у 2019-м. У маі ў Ганцавічах пабудуюць новую галоўную каналізацыйна-помпавую станцыю з перакладкай сетак каналізацыі. Першы пускавы комплекс з трох па рэканструкцыі ачышчальных збудаванняў у Лунінцы таксама здадуць сёлета.

У 2018-м завершаць і аб'ект са складанай назвай «Рэканструкцыя КНС № 7 і існуючай сістэмы самацёчнай каналізацыі ўздоўж аўтадарогі Дружба з будаўніцтвам напорнага трубаправода ад КНС № 7 у г. Брэсце (2, 3 пускавы комплекс)», рэканструкцыя якога распачата яшчэ ў 2015-м.

— Гарадскую каналізацыйна-помпавую станцыю № 7 рэканструююць, перакладуць сеткі самацёчнай каналізацыі і напорнага калектара, працягласць якога 9,2 км. Увод аб'екта ў эксплуатацыю дазволіць выключыць аварыйныя сітуацыі на калектары, — расказаў **Андрэй КРУГЛЕЙ, начальнік аддзела водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі Брэсцкага «Упраўлення ЖКХ»**.

Ачышчальныя збудаванні ў Пінску канчаткова рэканструююць у 2019-м, у тым жа годзе, магчыма, узвядуць і збудаванні каналізацыі ў Жабінцы, якое распачнуць сёлета.

— У вобласці шмат мястэчак, ачышчальным збудаванням у якіх неабходны капітальны рамонт або будаўніцтва новых. Мы плануем скласці адзіны пералік усіх гэтых аб'ектаў з указаннем арыенціровачнага кошту і крыніц фінансавання, — абазначыў Андрэй Круглей.

Сёлета мяркуюць цалкам распрацаваць праектна-каштарысную дакументацыю па рэканструкцыі ачышчальных збудаванняў у Драгічыне і Іванаве.

Віцебская вобласць

У Віцебскай вобласці ачышчальныя збудаванні тэрмінова патрабуюцца як мінімум у 24 населеных пунктах, а яшчэ ў 386-ці неабходны станцыі абезжалезвання. Усяго на балансе Віцебскаблводаканала 198 ачышчальных збудаванняў. Прафілактычныя і рамонтныя работы на аб'ектах, вядома, вядуцца, аднак на глабальную мадэрнізацыю патрэбны вялізныя сродкі.

— З міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі па шэрагу аб'ектаў вядуцца перамовы аб выдзяленні пазыкі на прыродаахоўныя мерапрыемствы і рэканструкцыю ачышчальных збудаванняў, — заўважыла **Валянціна МАСЬКО, галоўны інжынер унітарнага прадпрыемства «Віцебскаблводаканал»**. — Пакуль фінансаванне не зацверджана, не хочацца абнадзейваць людзей, называючы гарады, дзе плануецца мадэрнізацыя.

Сёлета ў вобласці не будзе ачышчальных збудаванняў каналізацыі, рэканструкцыю або будаўніцтва якіх завершаць. Разам з тым у 2018-м з улікам сродкаў Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця пачалі рэканструкцыю ачышчальных збудаванняў Віцебска, якую мяркуюць скончыць у 2019 годзе.

Колькасць жалеза ў артэзіянскай вадзе — праблемнае пытанне для вобласці. Таму па праграме «Камфортнае жыллё і спрыяльны асяродак» сёлета прадугледжана будаўніцтва станцый абезжалезвання. З прыцягненнем пазыкі Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця ў вобласці да 20 верасня 2018 года павінны завяршыць 15 такіх аб'ектаў.

Гомельская вобласць

Дзе размяшчаюцца старыя ачышчальныя збудаванні Рагачова, адчуваеш адразу пры ўездзе ў горад. Маральна яны даўно састарэлі і знаходзяцца ў аварыйным стане. Сёлета іх заменяць на новыя, якія з мінулай восені будуюцца ў іншым месцы горада, як кажуць, з нуля.

Гэта збудаванні біялагічнай ачысткі з сучасным энергаэфектыўным абсталяваннем. Сцёкі тут будуць ачышчацца біялагічным шляхам з дапамогай мікраарганізмаў актыўнага глею. А даачысціць вадкія адходы да нарматыўных паказчыкаў дапаможа мінімальны набор хімічных рэагентаў.

— Вада, прайшоўшы праз ачышчальныя збудаванні, будзе адпавядаць усім нарматывам, — запэўніў **Дзяніс ЗАБРОДСКІ, начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела ДА «Жыллёва-камунальная гаспадарка Гомельскай вобласці»**. — Дарэчы, на некаторых аб'ектах яна пасля ачысткі падаецца яшчэ на біялагічныя сажалкі, дзе нейкі час адстойваецца (так адбываецца даачыстка), пасля чаго натуральным шляхам сцякае ў раку. Дык у тых сажалках нават рыба водзіцца. І ўсё гэта дзякуючы актыўнаму глею.

У маі—чэрвені ў Рэчыцы мясцовыя камунальнікі плануюць запусціць новую станцыю абезжалезвання. Так што сёлета Рэчыцане змогуць піць ваду нарматыўнай якасці. Раней толькі каля траціны гараджан (прыкладна 20 тысяч) атрымлівалі з падземнай крыніцы ваду, якая абезжалезвалася. Астатнім (яшчэ прыкладна 44 тысячам) прыродны напой падаваўся без такой ачысткі.

Гродзенская вобласць

У сакавіку—красавіку 2018-га завершыцца рэканструкцыя ачышчальных збудаванняў у горадзе Свіслач Гродзенскай вобласці, а ў верасні — лістападзе — у самім абласным цэнтры.

Прывабныя і неардынарныя, знакамітыя і свабодныя

Тэлевядучыя для многіх становяцца ўзорамі для пераймання ў стылі, манеры апранацца, паводзінах і ацэнцы тых ці іншых падзей. Каляндарная вясна і Міжнароднае жаночае свята — самы час успомніць яркіх і чароўных прадстаўніц беларускіх тэлеканалаў. Яны разумныя і адукаваныя, нягледзячы на маладосць, ужо знакамітыя і... дагэтуль свабодныя. Яны выклікаюць захапленне прывабнай знешнасцю, да таго ж кожная з іх з'яўляецца асобай яркай і неардынарнай. Інакш паспяховай кар'еры на тэлебачанні не зрабіць! Ну, а мы ў сваю чаргу не маглі не пацікавіцца, якім павінен быць мужчына, каб спадабацца такім прыгажуням.

Анастасія БАГАМОЛАВА,

вядучая «Навін», праграмы «Твой горад» і «Навіны. Цэнтральны рэгіён» на тэлеканале «Беларусь 1»

Анастасія скончыла Інстытут журналістыкі БДУ. На тэлебачанні пачала працаваць з першага курса: спачатку ў праграме «Добрай раніцы, Беларусь» на «Беларусь 1», пасля — у перадачы «Наша раніца» на АНТ. Пасля курсаў для тэлевядучых у Белтэлерадыёкампаніі трапіла ў Агенцтва тэлевізійных навін, працавала ў праграме «Навіны рэгіёна».

Акрамя работы ў якасці тэлевядучай актыўна здымала рэпартажы і запісвала інтэрв'ю. Усё гэта Анастасія сумяшчала з навучаннем ва ўніверсітэце.

Сёння яна большасць часу прысвячае працы. У вольны час абавязкова наведвае трэнажорную залу, дзе аддае перавагу кардыёнагрузкам. Акрамя гэтага, вельмі любіць падарожжы. Пасля катання на снаўбордзе ў Швейцарыі ўлюбілася ў горы.

Тэлевядучая лічыць, што найлепшыя яе дасягненні яшчэ наперадзе.

— У жыцці няма нічога выпадковага. Мая прафесія была асэнсаваным выбарам, і спадзяюся, што камусьці такім чынам я прыношу карысць, — усміхаецца Анастасія.

Каб спадабацца нашай гераіні, мужчына павінен спалучаць мужнасць і інтэлект, а таксама шчодрасць.

Крысціна ВІНЯРСКАЯ,

вядучая прагнозу надвор'я на тэлеканале АНТ

Нягледзячы на тое, што на тэлеканале АНТ яна з'явілася зусім нядаўна, у яе немалы вопыт працы на тэлебачанні і тэлевізійная адукацыя. Пасля Інстытута сучасных ведаў, дзе атрымала прафесію перакладчыка, Крысціна пераехала ў Маскву і скончыла Інстытут тэлебачання і радыёвяшчання. Тонкасці тэлевізійнай кухні спасцігала на тэлеканале «Хатні». А потым зноў вярнулася ў Мінск. І працавала ў Агенцтве тэлевізійных навін на тэлеканале «Беларусь 1». А ў пачатку мінулага года ўвогуле засяродзілася на стварэнні дакументальнага кіно. Улетку, падчас святкавання 15-годдзя тэлеканала АНТ, калі праходзілі кастынгі па пошуку новых твараў, Крысціна вырашыла паўдзельнічаць.

— Мяне папрасіў аб гэтым мой дзядуля, ён вельмі верыць у мяне. І вось прайшло два з паловай месяцы, і, калі я ўжо і не чакала, што мяне возьмуць, мне патэлефанавалі. Я моцна здзівілася, але была вельмі гордая сабой! — з усмешкай дзеліцца тэлевядучая.

Прайшоўшы навучанне на тэлеканале, са снежня Крысціна Вінярская расказвае пра надвор'е.

— Маё захапленне журналістыкай, дзякуючы якому я і скончыла Інстытут тэлебачання ў Маскве, перарасло ў прафесію. І я гэтым цалкам задаволеная, — кажа Крысціна.

Вядучая ўпэўнена, што мужчына павінен быць моцны і гатовы браць на сябе адказнасць за сям'ю і дзяцей, а галоўнае — любіць сваю жанчыну.

Марыя ЛЕМЕШАВА,

вядучая «Навін спорту» і інфармацыйна-аналітычнай праграмы «Спортклуб» на тэлеканале АНТ

Тэлевядучая нарадзілася ў Смалявічах. Пасля школы скончыла машынабудаўнічы каледж, затым — Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. І трапіла на кастынг АНТ. У ім, між іншым, удзельнічала каля пяці тысяч прэтэндэнтаў. Але ўдача ўсміхнулася Марыі, якая яшчэ з дзяцінства выдатна чытала тэксты, за што настаўнікі прадказвалі ёй кар'еру на тэлеэкране. На АНТ дзяўчыну ўзялі як вядучую прагнозу надвор'я, але на той момант праект так і не выйшаў у эфір. А Марыя часова трапіла... у спартыўную рэдакцыю. Дагэтуль яна не мела ніякага дачынення да прафесійнага спорту. Але як вядома, няма нічога больш пастаяннага, чым часовае — вось ужо 12 гадоў прыгажуня расказвае пра навіны спорту. За гэты час разабралася не толькі ў тонкасцях футбола і тэніса, барацьбы і лёгкай атлетыкі, але і навучылася хутка і без памылак вымаўляць самыя складаныя спартыўныя назвы. Напрыклад ісландскага клуба «Хафнарф'юордур». А трымаць сябе ў выдатнай форме тэлевядучай дапамагаюць заняткі плаваннем і фітнесам.

Марыя рассталася з мужам і сёння выхоўвае трохгадовага сына Яна, якому прысвячае ўвесь вольны час.

— Пасля яго нараджэння вымушаная была на паўтара года сысці з эфіру, бо лічу, што маленькае дзіця павінны выхоўваць не блізкія ці нянька, а толькі мама, — кажа яна.

Зараз у паспяховай вядучай ёсць усё: уласная кватэра, аўтамабіль і любімая работа.

— Каб спадабацца, мужчына павінен быць такім жа мужным, як футбаліст Дэвід Бэкхэм, стыльным, як бізнесмен Уладзіслаў Даронін, і абаяльным, як акцёр Джордж Клуні, — усміхаецца Марыя.

Вольга БАЧКОВА,

вядучая праграмы «Тэлераніца» на тэлеканале «Беларусь 2»

Вольга нарадзілася ў Кыргызстане, у горадзе Фрунзэ (цяпер Бішкек). Скончыла там гуманітарны факультэт Кыргызска-Расійскага славянскага ўніверсітэта, атрымаўшы адукацыю псіхолага. Але пяць гадоў таму вырашыла пераехаць у Беларусь. І па яе прызнанні, улюбілася ў нашу краіну.

— Мяне вельмі ўразілі людзі: беларусы умеюць цаніць сяброўства, узаемаразуменне, падтрымку. Я не сустракаю спажывецкіх адносін, усё настолькі шчыра і ад душы, — прызнаецца вядучая. — Дружалюбнасць і адкрытасць беларусаў вельмі мяне кранаюць.

З дзяцінства Вольга захаплялася журналістыкай. Яшчэ ў падлеткавым узросце ў Фрунзэ займалася ёй у дзіцячым цэнтры, а яе кароткаметражны фільм пра СНІД нават заняў прызавое месца ў конкурсе, пасля выпускала сценгазету. Затым працавала на «Аўтарадыё», а першы вопыт на тэлебачанні атрымала на адным з кыргызскіх тэлеканалаў.

На Беларускае тэлебачанне пайсці парэкамендавалі сябры. Сваю работу на «Беларусь 1» пачынала ў Агенцтве тэлевізійных навін. Цяпер вядзе праграму «Тэлераніца» і ўпэўнена, што сакрэт добрага настрою — у мэце. Калі яна ў вас ёсць і вы да яе рухаецеся — добрай будуць і раніца, і дзень, і вечар.

Мэтанакіраванасць самой Вольгі здзіўляе: штодзень, нягледзячы на надвор'е, вядучая выходзіць на прабежку. 30 хвілін — і яна ў выдатнай форме і настроі. Настрой стварае і маленькая дачка Яраслаўна, якую выхоўвае Вольга пасля расставання з мужам. А ў мужчынах, акрамя мэтанакіраванасці і ўмення браць на сябе адказнасць, тэлевядучая цэніць шанаванне сямейных традыцый і павагу да старэйшых членаў сям'і.

Дзіяна РАВЯКОВА,

вядучая праграмы «Навіны эканомікі» і рубрыкі «НЕ:ВЫНІКІ» на тэлеканале «Беларусь 1»



Дзіяна нарадзілася ў Жлобіне. Скончыла Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, атрымаўшы дыплом інжынера па сертыфікацыі. І пэўны час працавала па спецыяльнасці, але задавальнення аднастайная работа з дакументамі не прыносіла.

— Я зразумела, што зрабіла не зусім правільны выбар, — кажа Дзіяна. — І аднойчы адважылася змяніць асяроддзе — проста звольнілася з нелюбімай работы. Першыя крокі на новым жыццёвым этапе пачала з удасканалення англійскай мовы ў лінгвістычным універсітэце і навучання на тэлевізійных курсах.

І калі ў Агенцтве тэлевізійных навін на тэлеканале «Беларусь 1» шукалі новыя твары, выбар спынілі на ёй. Дзіяна стала вядучай эканамічнай рубрыкі «У курсе» і праекта аб закадравым жыцці Агенцтва тэлевізійных навін «НЕ:ВЫНІКІ». У пазаэкранным жыцці тэлезоркі адно з захапленняў — псіхалогія. Вядучая нават атрымала дадатковую адукацыю і дыплом БДУ. Цяпер працягвае ўдасканальваць свае веды ў Маскоўскім гештальт інстытуце. І з'яўляецца, між іншым, практыкуючым псіхолагам.

— Журналістыка мяне захапляе і натхняе, у адрозненне ад першай, адказнай і даволі сумнай для мяне, прафесіі. Зараз займаюся таксама сур'ёзнай справай, але адначасова вельмі цікавай! Больш часу прысвячаю праграме «Навіны эканомікі». Таксама з'яўляюся аўтарам шэрагу рэпартажаў.

У планах энергічнай дзяўчыны — прайсці курсы экстрэмальнага кіравання аўтамабілем. І звязана гэта з асабістай гісторыяй.

— Блізкі мне чалавек трапіў у аўтамабільную катастрофу, і пасля я доўга не магла сесці за руль. Веды па псіхалогіі дапамаглі пераадолець гэты бар'ер, і цяпер я хачу дапамагаць іншым у такіх сітуацыях, — дзеліцца Дзіяна.

Будучы абраннік, па прызнанні тэлевядучай, павінен быць добрым сябрам і валодаць пачуццём гумару. Выдатна, калі разам з гэтым у яго будзе выдатнае адчуванне стылю — напрыклад, як у галівудскага акцёра Мэцью Макконахі.

Алена КРАВЕЦ.

«ЗВЯЗДА» — РУПЛІВЫМ ГАСПАДАРАМ!

Мінікультыватар Daewoo Power DAT 1800E

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на II квартал або I паўгоддзе 2018 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2018 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Мяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 18.04.2018 года будуць разыграны 7 набораў садовага інструменту No Brand Тарнада і суперпрыз — мінікультыватар Daewoo Power DAT 1800E. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 28.04.2018 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30.06.2018 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або I паўгоддзе 2018 г. і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам!» чытайце ў № 42 газеты «Звязда» ад 01.03.2018 г.

Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.

Тэрмін правядзення гульні — з 02.03.2018 па 30.06.2018.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3211 ад 27.02.2018 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або I паўгоддзе 2018 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

на II квартал або I паўгоддзе 2018 года

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(абавязкова) **(індэкс)**

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

ПАДАРОЖЖЫ, ПРЫГОДЫ, ПАЧУЦЦІ

«УСХОД—ЗАХАД»
«Беларусь 1», з 12 сакавіка

Гераіня доўгайграючай (48 серый у 2 сезонах) меладрамы сумеснай расійска-ўкраінска-турэцкай вытворчасці — Таццяна, якой некалі сяброўка нагадала трывалы шлюб і чатырох дзяцей, у рэальнасці атрымала вельмі сумнеўнае шчасце: меркантыльнага мужа і бяздзетнасць даўжынёй у дзесяць гадоў.

Аднойчы разам з мужам Таццяна едзе ў Стамбул, дзе трапляе на прыём да вядомага рэпрадуктолага Кемаля і ўжо праз некалькі тыдняў даведваецца, што зацяжарыла. Але праблемы толькі пачынаюцца, бо жанчына разумее, што бацькам яе будучага дзіцяці можа быць зусім не законны муж — а ў яе каханага доктара, аказваецца, ужо ёсць нявеста і сваякі, якія катэгарычна супраць уваходжання ў сям'ю славянкі. Асаблівая «разынка» серыяла ў тым, што, як сцвярджаюць яго аўтары, сюжэт заснаваны на рэальных падзеях інтэрнацыянальнага сямейнага шчасця.

«КАПІТАН»
«Беларусь 3», 15 сакавіка

Гэты гісторыка-прыгодніцкі фільм, які французскі рэжысёр Андрэ Юнебель зняў за некалькі гадоў да «Фантамаса», стаў адным з улюбёных у савецкіх гледачоў. Яго прафесійна дублявалі на рускай мове і мноства разоў паказвалі ў кіно і па тэлебачанні — шмат у чым дзякуючы абаянню галоўнага персанажа, героя-каханка Жана Марэ.

...1616 год. Сыну забітага караля Людовіку XIII усяго 15 гадоў, і ён яшчэ занадта юны для кіравання краінай. Таму каралева-маці Марыя Медзічы прызначае на пасаду першага міністра свайго палюбоўніка Канчыні, які таемна прагне сам захапіць трон і стаць уладаром Францыі. Міжволі ў інтрыгу аказваецца ўцягнутым малады шляхцянін Француа дэ Капестан, верны законнаму спадчыннику трона, які ўсімі сіламі спрабуе папярэдзіць будучага караля пра смяротную небяспеку, а паралельна знаходзіць выдатных сяброў і сапраўднае каханне...

«ЗАЛАТАЯ ЛІХАМАНКА»
«Культура», 18 сакавіка

Прыгодніцкая камедыя Чарлі Чапліна, якая выйшла на экраны амаль стагоддзе таму — у 1925-м, дагэтуль лічыцца адным з самых вядомых фільмаў Вялікага Нямога і адной з дзвюх найлепшых нямых камедый у гісторыі кіно.

Улюбёнец публікі, кволы і кранальны Маленькі валацуга, выпраўляецца насустрач новым прыгодам — на Аляску, на залатых капальнях якой спадзяецца разбагацець. У суровых снежных бурах герой сустракае такіх жа «паляўнічых» на золата, а таксама знаходзіць сваё вялікае каханне, дзеля якога маленькі чалавечак гатовы кінуць выклік абставінам, моцным кулакам і нечакана сапраўды стаць знакамітым і багатым...

Панядзелак, 12 сакавіка

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.35** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.15 «Зона Х». (16+).
9.10 «Галоўны эфір».
10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Усход — Захад». (16+).
12.45, 13.05, 15.25 Меладрама «Маці і мачаха». (16+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 «Беларуская часінка».
21.00 «Панарама».
21.50 «Нашы».
22.10 Серыял «След» (16+).
23.55 «Арэна».
0.50 «Дзень спорту».
1.05 «Патруль 113. За кадрам». 1-я серыя.
1.20 Кінаэпапея «Ціхі Дон» (12+).

Беларусь 2

7.00 «Тэлераніца» (12+).
9.00, 18.35, 21.55 «Тэлебарометр».
9.30, 20.00 Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.30 «Капейка ў капейку» (12+).
Такая сітуацыя склалася на працягу апошніх пяці гадоў. І з кожным годам праблема становіцца больш вострай, стан вады пагаршаецца. Псуецца і сантэхніка. Іржа папросту раз'ядае паверхні мыек, ваннаў, унітазаў. Не ўратоўваюць нават дарагія фільтры. Вось і прыходзіцца мяняць сантэхніку, пішуць у сваіх зваротах жыхары вуліцы Інтэрнацыянальнай аграгарадка Путрышкі. Асабліва іх непакоіць той факт, што гэту ваду ўжываюць дзеці, што яна выкарыстоўваецца для прыгатавання ежы.

Санітарныя службы ацэньваюць якасць вады ў Путрышках як нездавальняючую. Па словах супрацоўнікаў аддзялення камунальнай гігіены Гродзенскага занальнага Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, колькасць жалеза ў вадзе і мутнасць амаль у тры разы перавышаюць норму. Ды і колькасць спажыўцоў, якія падключаны да мясцовага водаправода, значна большая за норму. Перагруз таксама негатыўна адбіваецца на канчатковым выніку.

Асабліва пакутуюць тыя, хто атрымлівае ваду ад галоўнай свідравіны, якая знаходзіцца на балансе камунальнай службы раёна.

Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, падчас суботняй прамой лініі адзначыў:

— Апошнім часам большасць зваротаў ад жыхароў Гродзенскай вобласці, і асабліва з сельскай мясцовасці, звязана з пытаннямі якасці вады. Мы ўважліва аднесліся да неабходнасці рашэння гэтай праблемы. На сесіі па размеркаванні бюджэту на 2018 год заклалі адзін мільён рублёў на вырашэнне гэтай праблемы. Мы сёлета павінны пабудаваць 10 станцый абезжалезвання ў аграгарадках, бо гэта ў асноўным праблема сельскай мясцовасці. А ўсяго 150 населеных пунктаў Гродзенскай вобласці патрабуюць паляпшэння якасці вады. Першыя крокі ў гэтым кірунку ўдалося зрабіць падчас дзеяння праграмы «Чыстая вада».

Цяпер гэта праблема будзе вырашацца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, але не толькі. Разам з Міністэрствам ЖКГ распрацоўваем іншыя крыніцы фінансавання. У прыватнасці, пазыковыя сродкі, крэдытныя рэсурсы міжнародных арганізацый, якія пад гэты кірунак даюць ільготныя, доўгатэрміновыя крэдыты. Спадзяёмся, што агульныя намаганні прынясуць плён і дапамогуць у наступныя 3—4 гады поўнасцю вырашыць праблему якаснай вады і ў сельскай мясцовасці.

Праблема «з барадой»

Каб гэта пытанне зняць з парадку дня, у Путрышках трэба пабудаваць станцыю абезжалезвання. Калісьці такі аб'ект ужо ўносілі ў абласную праграму «Чыстая вада». Але ён так і не быў рэалізаваны.

У той жа час большая частка населеных пунктаў Гродзенскага раёна такія станцыі ўжо маюць. Толькі за апошнія некалькі гадоў уведзена каля дзесяці, а ўсяго ў раёне іх амаль 30 — гэта больш, чым у любым іншым раёне вобласці.

Як паведамілі ў абласным упраўленні ЖКГ, будаўніцтва станцый па абезжалезванні ўваходзіць у лік прыярытэтных кірункаў рэгіёна. Яны будуць фінансавацца ў першую чаргу. Так, сёлета ў Гродзенскай вобласці плануецца пабудаваць дзесяць станцый, у тым ліку некалькі — у Гродзенскім раёне. Трапілі ў гэты спіс і аграгарадкі Путрышкі і Свіслач.

Работа паступова рухаецца. Як паведамілі ў раённым аддзеле ЖКГ, цяпер вядзецца распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі. Адным з месцаў будучага аб'екта можа стаць памяшканне былой кацельнай каля водазабора.

По папярэдніх разліках, кошт будаўніцтва складае 100 тысяч рублёў. Дарэчы, столькі сродкаў плануецца выдаткаваць на кожную з дзесяці станцый. Праектны этап работ бяруць на сябе раённыя ўлады. А вось аб канчатковых тэрмінах гаварыць пакуль рана. Хоць прадстаўнікі абласных улад запэўнілі, што станцыі павінны запрацаваць да канца гэтага года.

Пералік населеных пунктаў, якія маюць патрэбу ў такіх аб'ектах, ужо вызначаны. Галоўны акцэнт прыпадае на сельскія населеныя пункты, дзе якасць вады па стане жалеза горшая, чым у гарадах. Будаўніцтва будзе весціся ў рамках рэалізацыі падпраграмы «Чыстая вада», дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе на 2016—2020 гады». Акрамя гэтага, Гродзенскім абласным выканаўчым камітэтам зацверджаны Комплекс мерапрыемстваў, накіраваны на павышэнне ўзроўню добраўпарадкавання аграгарадкоў і іншых перспектыўных сельскіх населеных пунктаў на 2017—2020 гады. У іх пералік уключана будаўніцтва 58 станцый абезжалезвання ў аграгарадках. Першыя дзесяць аб'ектаў плануецца пабудаваць у аграгарадках Свіслач і Путрышкі Гродзенскага раёна, Вялікія Эйсманты — Бераставіцкага, Забалаць — Воранаўскага, Мачуліна — Ваўкавыскага раёнаў. Станцыі таксама з'явяцца ў Геранёнах Іўеўскага, Варнянах Астравецкага раёнаў і іншых аграгарадках, дзе праблемы якасці вады звязаны з высокай колькасцю жалеза.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ЯК АГУЛЬНАЯ МЭТА

Тэрмінова неабходны новыя ачышчальныя збудаванні ў Скідзелі, дзе, дарэчы, у свой час ужо пачыналі будаўніцтва, аднак скончыліся грошы, і яно было перапынена.

— Скідзель — горад-спадарожнік Гродна, і перспектыва пад забудову тут вялікая. Магутнасці ачышчальных збудаванняў нарошчваюцца, — расказаў пра планы вобласці **генеральны дырэктар ДА «Жыллёва-камунальная гаспадарка Гродзенскай вобласці» Алег ШАФРАНСКІ**. — Пры гэтым у значна горшым стане ачышчальныя збудаванні ў Ашмянах, Воранаве і Дзятлаве. У Ашмянах сітуацыя ўскладняецца тым, што збудаванні прымаюць на сябе прамысловыя сцёкі ад перапрацоўшчыкаў. І паказчык біяхімічнага ўжывання кісларoду вельмі шкодна ўплывае на фаўну ў рацэ Ашмянка.

Ачышчальныя збудаванні ў Смаргоні будуць крэдытавацца на зваротных умовах Паўночнай экалагічнай фінансавай карпарацыяй (*НЕФКО*). Як мяркуе дырэктар, працэс тут ужо запушчаны і будзе рэалізаваны.

А вось праект коштам 9 млн еўра ў Лідзе, магчыма, пачне рэалізоўвацца ўжо сёлета. Тут сумесна з ачышчальнымі збудаваннямі будуць рэканструяваць басейн каналізавання горада і напорныя калектары — тое, па чым пампуюць сцёкі на збудаванні. Па аб'екце ўжо заключаны грантавае і крэдытнае пагадненні.

Магілёўская вобласць

Рэканструкцыя ачышчальных збудаванняў сёлета скончыцца ў Мсціслаўлі і Быхаве Магілёўскай вобласці. Мяркуецца, што ў 2018-м у Магілёве ўвойдзе ў строй і каналізацыйны калектар, які будуецца ўжо трэці год. Акрамя досыць вялікай даўжыні ў 1,8 кіламетра, ён вызначаецца яшчэ і складанымі гідрагеалагічнымі ўмовамі — работы адбываюцца ў пойме ракі Дняпро.

— Пакуль пракладзена 1,2 км калектара. Астатнія 600 метраў будуць выконвацца метадам накіраванага бурэння (без траншэй) уздоўж нашых гістарычных будынкаў, — абазначыў **Віктар МАЛАШКОЎ, начальнік аддзела капрамонту, будаўніцтва і інвестыцый ДА «Жыллёва-камунальная гаспадарка Магілёўскай вобласці».**

У снежні 2017-га мясцовыя камунальнікі падпісалі кантракт на будаўніцтва калектара ў Бабруйску, які таксама плануюць скончыць сёлета да верасня.

Новыя ачышчальныя збудаванні ў вобласці ўзводзіць у бягучым годзе не запланавана. Пры гэтым аб'екты ў пасёлку Елізава Асіповіцкага раёна ўжо знаходзяцца ў крытычным стане. Ды і ў самім Асіповічах неабходна мадэрнізацыя. Тое ж датычыцца і падобнага аб'екта ў Краснаполлі.

— На ачышчальных збудаваннях у Шклове таксама маюцца перавышэнні гранічна-дапушчальных канцэнтрацый забруджвальных рэчываў у зыходнай вадзе. У Слаўгарадзе збудаванням, што знаходзяцца ў пойме ракі Сож, патрабуецца капітальны рамонт, — заўважыў спецыяліст. — Усе гэтыя аб'екты мы прадставілі місіі Сусветнага банка. Як толькі адкрыецца пазыка, зоймемся іх рэалізацыяй.

Фота БЕЛТА.

На станцыі абезжалезвання ў аграгарадку Копці Віцебскага раёна.

Мінская вобласць

Летась у Мінскай вобласці за кошт пазыкі Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця распачата ўзвядзенне новых ачышчальных збудаванняў каналізацыі ў Беразіне і рэканструкцыя такога аб'екта ў Лагойску. Сёлета абодва яны будуць скончаны.

У 2018-м мясцовыя камунальнікі плануюць рэалізаваць таксама буйны аб'ект у Барысаве. Перакласці каналізацыйны калектар даўжынёй прыблізна 11 кіламетраў і коштам работ каля 2,5 млн долараў.

— Новыя трубы калектара папярэдзяць магчымыя аварыйныя сітуацыі ў далейшым і забяспечаць надзейнасць эксплуатацыі сістэмы, — падкрэсліў **Віталь МІКУЛОВІЧ, начальнік аддзела водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі ДА «Жыллёва-камунальная гаспадарка Мінскай вобласці».**

Згодна з абласной інвестыцыйнай праграмай на 2018 год, запланавана будаўніцтва чатырох аб'ектаў водазабеспячэння, у тым ліку ў Беразіне, Мядзеле і Барысаве, аднак узвядзенне менавіта аб'ектаў каналізацыі за кошт абласнога бюджэту ў вобласці сёлета не запланавана. Тым не менш ужо падрыхтавана праектна-каштарысная дакументацыя на рэканструкцыю асобных ачышчальных збудаванняў у Фаніпалі, Любані, Клецку. Праўда, яна патрабуе карэкціроўкі, удакладніў Віталь Мікуловіч:

— Гэтыя тры аб'екты зведзены ў адзін інфраструктурны праект, накіраваны на разгляд у Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця. Канчатковае рашэнне па фінансаванні пакуль прапрацоўваецца. Пры гэтым мы гатовыя прадставіць інвестпрапановы і па іншых аб'ектах.

Ірына СІДАРОК.

МЕРКАВАННІ

ФОРМУЛА ВАДЫ

Як на смак адрозніць калодзежную ваду ад водаправоднай? Ці п'е ваду з-пад крана дырэктар Водаканала? І ці адпавядае нормам вада ў сталіцы? Пра якасць найважнейшага прыроднага рэсурсу мы запыталі тых, хто арыентуецца ў гэтым пытанні як рыба ў вадзе.

Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, прэс-сакратар Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі:

— Асабіста я выкарыстоўваю звычайную ваду з-пад крана, якая цячэ ў кожнай кватэры Мінска. І якасць яе задавальняе. У мяне ёсць маленькае дзіця — яму я заказваю бутыляваную ваду.

Марыя ЛІСТАПАДАВА, старшыня Запольскага сельскага Савета дэпутатаў Бялыніцкага раёна:

— Я ў асноўным выкарыстоўваю ваду з калодежа. Яна чыстая — у норме па нітратах і па мутнасці. Мы сумесна з санстанцыяй адзін-два разы ў год, па неабходнасці, робім аналіз. Можна заўважыць адрозненне калодзежнай вады па смаку — яна больш мяккая, чым з-пад крана. Калі калодзеж чысты і дастаткова глыбокі, то і вада там смачнейшая.

Дзмітрый ДРОЗД, дырэктар прадпрыемства «Водаканал Мінскага раёна»:

— Дзейнасць нашай арганізацыі распаўсюджваецца на 240 населеных пунктаў, дзе мы з'яўляемся пастаўшчыкамі паслуг. Кантроль якасці вады ў Мінскім раёне праводзіцца наступным чынам. У нас заключаны дагавор з органамі санітарнага нагляду — сваёй лабараторыі няма. Згодна з распрацаванай праграмай, кожны месяц, тыдзень ці квартал бяром пробы. У залежнасці ад вынікаў назначаюцца мерапрыемствы па паляпшэнні якасці вады.

У нас ёсць 470 свідравін. Калі ў якой-небудзь з іх паказчык па нітратнасці будзе вышэйшы за норму, мы адразу выводзім свідравіну з эксплуатацыі і прамываем. Летась такіх выпадкаў было шэсць. Напрыклад, у пасёлку Анопаль тры месяцы дзейнічала абмежаванне па выкарыстанні вады. Мы ўсталявалі станцыю, якая выдаляе нітратную групу і жалеза, і ўсе абмежаванні знялі.

Цяпер самая вялікая праблема для Мінскага раёна — гэта колькасць жалеза ў вадзе. На гэты элемент санітарнымі нормамі ўсталяваны жорсткі нарматыў. Каля 75 % проб па жалезе праходзяць праверку, а з астатнімі ёсць праблемы. Жалеза — прыродны паказчык, таму змагацца з гэтай праблемай можна толькі ўсталяваннем станцый абезжалезвання. Сам я, дарэчы, п'ю ваду з-пад крана — ніякіх праблем з якасцю няма.

Наталля САЗАНАВА, намеснік начальніка вытворчасці «Мінскводаправод» УП «Мінскводаканал»:

— Маніторынг якасці вады ў сталіцы праводзіцца згодна з праграмай вытворчага кантролю на пяць гадоў. Яна зацвярджалася ў 2016 годзе Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам і праходзіла экспертызу ў Мінскім гарадскім цэнтры гігіены. Там прапісана перыядычнасць зняцця паказчыкаў, самі паказчыкі, па якіх адбіраюцца пробы. Мы прытрымліваемся санітарнага заканадаўства, і ўся пітная вада ў сталіцы адпавядае нормам. Кожны дзень праводзіцца маніторынг якасці кантрольных кропак у горадзе. У нас ёсць акрэдытаваная цэнтральная лабараторыя, якая выконвае вялікі спектр аналізаў. У сваю чаргу тэхналагічныя лабараторыі, якія знаходзяцца на некаторых водазаборах, могуць кантраляваць якасць вады кожны дзень. Але афіцыйна па рабочай праграме мы кантралюем якасць у свідравінах кожны квартал. Пры гэтым бываюць дадатковыя заборы ў залежнасці ад неабходнасці.

Згодна з правіламі карыстання «Мінскводаканал» займаецца падачай вады, абслугоўваннем сетак і адказвае за якасць паслугі да мяжы балансавай прыналежнасці. Значыць, калі, напрыклад, гэта жылы дом, то да фундамента — гэта зона адказнасці «Мінскводаканала», пасля — ЖЭСа ці таварыства ўласнікаў. Здараецца, што ў кране карыстальніка якасць пагаршаецца з-за няякаснага выканання рэгламентных работ ва ўнутрыдамавых сетках.

Я п'ю ваду з-пад крана. І як чалавек, які адказвае за водападрыхтоўку і якасць вады ў Мінску, не баюся гэтага рабіць. Я ведаю, што ўся вада ў горадзе адпавядае нормам.

Марыя ДАДАЛКА.

ЧЫСТАЯ ВАДА

«ВЫМЫЦЬ» ЛІШНЯЕ ЖАЛЕЗА

Станцыя па абезжалезванні вады ў аграгарадку Кракоўка ў Ашмянскім раёне павінна з'явіцца сёлета ў маі. Населенаму пункту такое прыстасаванне жыццёва неабходнае, кажуць мясцовыя ўлады. Узровень жалеза ў тутэйшай вадзе ўдвая перавышае дазволеныя нормы, хоць па астатніх параметрах у прынцыпе адпавядае гранічна дапушчальным канцэнтрацыям розных рэчываў.

Празмерная колькасць жалеза ў вадзе — праблема многіх беларускіх мястэчак, аднак у ашмянскім краі, дзе карыстаюцца ў асноўным паверхневымі водамі з іх не найлепшымі пітнымі якасцямі, гэта найбольш адчувальна, кажуць раённыя камунальнікі. Каб вада ў аграгарадку Кракоўка стала якаснай па ўсіх крытэрыях, патрэбна станцыя коштам 207 тысяч рублёў. Адпаведную суму плануецца атрымаць па абласной інвестыцыйнай праграме (з абласнога інвестыцыйнага фонду). Там ужо пацвердзілі факт фінансавання будаўніцтва станцыі, аднак графікаў паступлення грошай пакуль няма.

Тым не менш спецыялісты жыллёва-камунальнай гаспадаркі запланавалі работы па ўзвядзенні станцыі на лета. Ужо падрыхтавана праектна-каштарысная дакументацыя, пройдзена экспертыза аб'екта. Каторы год мясцовая ЖКГ працуе з інфраструктурай: рамантуюць і перакладаюць водаправодныя сеткі ў аграгарадку Кракоўка. З 2014-га тут заменена ўжо больш як 3,5 кіламетра «водных» камунікацый.

— Будзе няправільна, калі станцыя з добрай фільтрацыяй запрацуе, а вада пацячэ па трубах, якія пракладваліся ў далёкія часы і большай часткай іржавыя, — пракаменціраваў работу **Вячаслаў ЯНКОЎСКІ, намеснік дырэктара Ашмянскага РУП ЖКГ.** — Людзі не атрымаюць эфекту, на які разлічваюць, і работа па будаўніцтве станцыі пройдзе ўпустую. Каб гэтага не здарылася, мы і займаемся заменай сетак.

Будаўніцтва станцыі абезжалезвання, а фактычна — некалькіх павільёнаў — не такая ўжо і складаная тэхнічна рэч, кажуць спецыялісты. Прывозіцца дадатковае абсталяванне для фільтрацыі, якое ўразаецца ў існуючую сістэму, і цыркуляцыя вады пускаецца яшчэ па адным крузе. На ўсё гэта разам з добраўпарадкаваннем тэрыторыі вакол спатрэбіцца каля месяца.

Цэнтралізаванай водаправодной сістэмай у Кракоўцы карыстаецца 988 чалавек. Намеснік дырэктара Ашмянскай ЖКГ не выключае, што са з'яўленнем станцыі абезжалезвання іх колькасць павялічыцца.

Хоць з'яўленне чыстай вады ў кожнай дадатковай хаце, безумоўна, радуе, спецыялісты кажуць, што так павінна быць паўсюдна. Таму побач са станоўчым настроем у іх заўжды прысутнічае пачуццё дыскамфорту ад таго, што яшчэ не ўсё зроблена і наперадзе шмат работы па ўдасканаленні якасці піцця — ужо ў іншых месцах. Наступныя населеныя пункты ў Ашмянскім раёне, якім таксама вельмі патрэбны станцыі абезжалезвання, — гэта аграгарадкі Навасёлкі і станцыя Ашмяны.

Прагназаваць, калі сітуацыя выправіцца і там, спецыялістам цяжка. Можа, гэта здарыцца ў 2019-м, а можа і не. Праграма «Чыстая вада», якая паспяхова стартавала ў свой час у Беларусі, на працягу апошніх пяці гадоў буксавала. Сёлета вада зноў стала адным з прыярытэтных кірункаў работы. Думаецца, у немалой ступені садзейнічала гэтаму заўвага Прэзідэнта да якасці пітной вады на мінулагоднім кастрычніцкім рэспубліканскім семінары «Аб удасканаленні і развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны». Кіраўнік дзяржавы заўважыў тады: «26 % проб вады ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях не адпавядаюць патрабаванням нарматываў па колькасці жалеза. Забяспечанасць станцыямі абезжалезвання па рэспубліцы — 42 %. Гэтае пытанне неабходна вырашыць да 2025 года».

— Мы не забываем аб праблеме людзей. Як толькі скончым станцыю ў Кракоўцы, адразу зойдземся праектаваннем наступных станцый, каб не губляць час, — запэўніў намеснік дырэктара ЖКГ. — Якасць вады непасрэдна ўплывае на стан здароўя чалавека. Так што будаўніцтва станцый абезжалезвання — гэта архіважная задача.

У Беларусі трэба збудаваць 1200 станцый абезжалезвання, і гэта толькі ў пасёлках, дзе пражывае звыш 100 чалавек. Аднак аблвыканкамі летась збудавана толькі 10 станцый на суму 8,6 млн рублёў. З якіх 7 млн — крэдытныя рэсурсы, афармленыя па мэтавых дзяржаўных праграмах. Пры гэтым Гомельская, Гродзенская і Магілёўская вобласці ў 2017-м не выдзелілі на гэты кірунак ні капейкі. *(З матэрыялаў выніковай калегіі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі за 2017 г.)*

Усяго ў Гродзенскай вобласці абласной інвестыцыйнай праграмай на будаўніцтва станцый абезжалезвання запланавана выдаткаваць каля мільёна беларускіх рублёў. Чыстая вада прыйдзе, як мяркуецца, у Ваўкавыскі, Слонімскі, Лідскі, Навагрудскі раёны. А ў Шчучынскім і Гродзенскім раёнах з'явяцца артэзіянскія свідравіны.

Ірына СІДАРОК.

ЗДАРЭННІ

Такія вітаміны нам не патрэбны

Неспрыяльнае надвор'е не перашкодзіла магілёўскім мытнікам разам з інспектарамі дарожнага руху годна несці сваю службу.

У Горацкім раёне прыпынены рух грузавога аўтамабіля SCANIA, які нелегальна перавозіў 20 тон яблыкаў на 61 тысячу рублёў. Як паведаміла прэс-служба Магілёўскай мытні, у кіроўцы не аказалася ні суправаджальных дакументаў на гэты груз, ні фітасанітарнага сертыфіката. Машына, дарэчы, належыць расійскаму суб'екту гаспадарання і трымала курс на Расію. За невыкананне беларускага заканадаўства парушальніку свеціць штраф у памеры да 50 % ад кошту тавару (частка 4 артыкула 12.17 КаАП Рэспублікі Беларусь).

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Пажар са сталёвым адценнем

Увечары ў электраплавільным цэху Беларускага металургічнага завода спрацавала пажарная сігналізацыя. Літаральна праз адну хвіліну ратавальнікі былі на месцы падзей. Яны ўбачылі, што тунэль, у якім пракладзены сілавыя кабелі, па якіх падаецца электраэнергія, моцна задымлены.

— Нашы байцы аператыўна ліквідавалі ўзгаранне, — паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — На шчасце, ніхто не пацярпеў. Але разам з тым полымя пашкодзіла больш за 30 тысяч пагонных метраў ізаляцыі электрычных кабеляў. З-за гэтага быў спынены тэхналагічны працэс выплаўкі сталі.

Як паведаміў **прэс-сакратар Беларускага металургічнага завода Аляксандр АЛЕСІК,** меркаванай прычынай пажару стала кароткае замыканне. Часова спыніліся тры цэхі — электрасталеплавільны № 1, сортапракатны № 1 і капаравы. Таксама была парушана заводская тэлефонная і інтэрнэт-сувязь.

— Зараз на прадпрыемстве распрацоўваецца пакрокавы план, які дапаможа пераадолець наступствы надзвычайнага здарэння. На шчасце, вытворчыя страты будуць мінімальныя. Сталеплавільную вытворчасць да гэтага планавалася прыпыніць з 7 да 14 сакавіка для мадэрнізацыйных работ. Але ліквідаваць наступствы здарэння мы будзем адначасова з гэтымі работамі.

На месца падзей асабіста выязджаў **міністр прамысловасці Віталь Воўк**, каб арганізаваць аператыўны штаб па ліквідацыі наступстваў узгарання на прадпрыемстве.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

УСЕ ПРЫЕДУЦЬ ДА ВАС!

На Шуміліншчыне штомесячныя Дні работы з насельніцтвам дазваляюць аператыўна вывучаць і вырашаць праблемныя пытанні, папярэджваць звароты грамадзян.

Толькі прамыя зносіны

— Дні работы з насельніцтвам — эфектыўная форма работы з вяскоўцамі. Галоўная мэта — прамыя стасункі прадстаўнікоў улады і людзей, вывучэнне і вырашэнне праблемных пытанняў. А паралельна — папярэджанне правапарушэнняў і злачынстваў, умацаванне супрацьпажарнай бяспекі, прафілактыка сацыяльнай неўладкаванасці. У дадатак адказныя асобы нагадваюць грамадзянам аб неабходнасці наводзіць парадак на падворку, браць удзел у добраўпарадкаванні вёскі, — расказвае **старшыня Шумілінскага раённага Савета дэпутатаў Ірына НОВІКАВА.**

Напярэдадні мерапрыемства на тэрыторыі канкрэтнага сельсавета праводзіцца падрыхтоўка праз раённую газету старэйшын, паведамляецца, калі яно адбудзецца і дзе.

Ствараюцца рабочыя групы, якія ўзначальваюць старшыня раённага Савета дэпутатаў, намеснікі старшыні райвыканкама. У складзе груп — прадстаўнікі аддзелаў і ўпраўленняў райвыканкама, спецыялісты тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнай абароны насельніцтва, работнікі РАУС, РАНС, дэпутаты, старэйшыны...

Старшыня сельскага Савета, на тэрыторыі якога праводзіцца Дзень работы з насельніцтвам, знаёміць членаў груп са становішчам спраў. Пры гэтым асаблівая ўвага скіравана на праблемныя пытанні і магчымыя шляхі іх вырашэння.

— Падчас такіх Дзён пастаянными сталі падворныя абходы дамоў грамадзян, якія злоўжываюць спіртным, адзінока пражываючых, шматдзетных, — працягвае Ірына Новікава.

Вяскоўцам раздаюць улёткі і буклеты па прафілактыцы пажараў, злачынстваў і правапарушэнняў, а таксама па відах і кошце сацыяльных паслуг.

Для «візіцёраў» усё цікава: ці ёсць нараканні на работу ЖКГ, устаноў аховы здароўя, культуры, гандлю і бытавога абслугоўвання? Як можна выправіць сітуацыю? Што для гэтага неабходна?

Калі вёсачкі невялікія, асаблівы інтарэс да «крам на колах»: ці прыязджаюць па графіку, ці прывозяць усё, што хацелі б купіць, ці спраўны халадзільнік, ці на ўсіх таварах указаны цэны?

Пастаянна ў рамках Дня работы з насельніцтвам арганізуецца і Дзень прафілактыкі. Падчас іх праводзіцца адкрытае пасяджэнне савета грамадскага пункта аховы правапарадку, індывідуальна працуюць з грамадзянамі нарколаг і псіхолаг раённай бальніцы.

Арганізуюцца і сустрэчы ў працоўных калектывах, установах адукацыі. А яшчэ адказныя асобы (старшыня райвыканкама і райсавета, намеснікі старшыні райвыканкама) праводзяць выязныя прыёмы, выслухоўваюць людзей, «бяруць на аловак» тое, што турбуе.

На кантролі, а не «для галачкі»

Па выніках Дзён работы з насельніцтвам складаецца пратакол даручэнняў па выкананні просьбаў грамадзян, па паляпшэнні работы арганізацый, размешчаных на тэрыторыі адпаведнага сельсавета.

— Значная частка пытанняў вырашаецца аператыўна. Па пытаннях, пастаўленых на кантроль, дакладваюць сітуацыю і старшыні іншых сельскіх Саветаў, на тэрыторыі якіх раней праводзіліся такія мерапрыемствы, — канстатуе старшыня райсавета.

Падчас падвядзення вынікаў заслухоўваюцца справаздачы кіраўнікоў арганізацый, раённых службаў аб рэагаванні на заўвагі, якія паступілі падчас правядзення сходаў, выязных прыёмаў.

Летась з 127 пастаўленых на кантроль пытанняў было вырашана 117, дзесяць застаецца на кантролі. З дапамогай правядзення Дзён работы з насельніцтвам удаецца аператыўна вырашаць праблемныя пытанні людзей, папярэджваць звароты грамадзян у больш высокія інстанцыі, умацоўваць давер да ўлады.

Найперш жыццёвыя пытанні

Асаблівай павагі заслугоўвае дзейнасць старэйшын Шумілінскага раёна, якіх у раёне 127 на 240 вёсак. У мінулым годзе ў сельскіх населеных пунктах з іх удзелам адбылося больш за 300 сходаў грамадзян, на якіх разглядаліся самыя злабадзённыя, жыццёвыя пытанні.

Як нагадала Ірына Новікава, старэйшыны ў першую чаргу прадстаўляюць і адстойваюць інтарэсы аднавяскоўцаў. Яны агітуюць прымаць удзел у работах па добраўпарадкаванні, спрыяюць вырашэнню пытанняў водазабеспячэння, закупкі лішкаў сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама кантралююць работу аўтамагазінаў, вулічнага асвятлення. Яны ж уваходзяць у склад назіральных камісій, саветаў грамадскіх пунктаў аховы правапарадку...

— Іх можна назваць «вачыма і вушамі, і рупарамі вёсак», бо ведаюць аб усім, што там адбываецца. Аператыўна паведамляюць у сельскі Савет, кіраўнікам арганізацый і службаў аб праблемных пытаннях. Усе старэйшыны — людзі з актыўнай жыццёвай пазіцыяй і добрымі арганізатарскімі здольнасцямі. У прыватнасці, дзякуючы актыўнаму ўдзелу старэйшын, летась у межах самаабкладання сабралі 2,3 тысячы рублёў, — працягвае Ірына Новікава.

Што за вёска без свята?

Марыя Цімафееўна Лялюга, старэйшына вёскі Лялюгі Дабейскага сельсавета, пастаралася, каб маленькі населены пункт з насельніцтвам 23 чалавекі быў дагледжаны. А яшчэ яна — майстар ладзіць святы.

З удзелам старэйшын, дэпутатаў сельскіх Саветаў, сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, работнікаў устаноў культуры пастаянна праводзяцца святы вёсак, вуліц, двароў «Павага табе, маё сяло». Толькі летась праведзена 21 такое мерапрыемства.

А па ініцыятыве старэйшыны вёскі Дабея Дабейскага сельсавета Алы Мікалаеўны Бубен праведзена карпатлівая праца па зборы матэрыялаў пра гісторыю гэтага населенага пункта, адкрыты памятны знак і мемарыяльная дошка ў гонар 610-й гадавіны першага згадвання вёскі, на сайце «Аднакласнікі» створана група «Дабея. Землякі».

Старэйшына вёскі Мікалаева Мікалаеўскага сельсавета Марыя Мацвееўна Кралько арганізавала работу па навядзенні парадку і яго падтрыманні на могілках...

Старэйшына вёскі Мішневічы аднайменнага сельсавета Святлана Пятроўна Зуева актыўна прапагандуе здаровы лад жыцця і займаецца прафілактыкай парушэнняў правапарадку. Матрона Уладзіміраўна Гушча, старэйшына вёскі Бубалі Мікалаеўскага сельсавета і дэпутат сельскага Савета, актыўна аказвае дапамогу адзінока пражываючым, а яшчэ жанчына пільна кантралюе работу аўтакрам, вулічнага асвятлення, сочыць за добраўпарадкаваннем населенага пункта.

Каб стымуляваць працу старэйшын, ім штоквартальна, у адпаведнасці з інструкцыямі, якія зацвярджаюцца рашэннямі сельскіх Саветаў дэпутатаў, выплачваюць грашовае ўзнагароджанне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗАВЕРЕНО
Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
07.03.2018
Лихачевский В. В.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
ОБ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ СЕМНАДЦАТОГО ВЫПУСКА
Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой»

1. Полное и сокращенное наименование Эмитента (на белорусском и русском языках).
Наименование:
на белорусском языке:
полное: Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ВільнюсБуд»;
сокращенное: СТАА «ВільнюсБуд»;
на русском языке:
полное: Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой»;
сокращенное: СООО «ВильнюсСтрой».

2. Место нахождения Эмитента, телефон, факс, электронный адрес.
Республика Беларусь, 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1 этаж, каб. 60, телефон/факс: +375 17 222 79 80, электронный адрес: vilnusstroy@gmail.com.

3. Дата, номер государственной регистрации Эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего.
Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой» зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 20.10.2010 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за регистрационным номером 191434087.

4. Номера расчетных счетов Эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при размещении Облигаций, наименование обслуживающих банков.
Средства при размещении жилищных облигаций семнадцатого выпуска (далее – Облигации) будут поступать по следующим реквизитам Эмитента:
получатель: СООО «ВильнюсСтрой»;
УНП: 191434087;
расчетный счет:
BY36TECN30127220900120000000 в ОАО «Технобанк», г. Минск, ул. Кропоткина, 44, БИК TECNBY22;
BY40OLMP30120000707580000933 в ОАО «Белгазпромбанк», г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, БИК OLMPBY2X;
назначение платежа: оплата за жилищные облигации семнадцатого выпуска СООО «ВильнюсСтрой» согласно договору от _____.____.20____ №_____.

5. Сведения о депозитарии, с которым заключен депозитарный договор с Эмитентом.
Наименование: Закрытое акционерное общество «Агрокапитал», код депозитария – D01.
Место нахождения: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. Революционная, 6В.
Закрытое акционерное общество «Агрокапитал» зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 18.08.2000 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за регистрационным номером 101000004.
Закрытое акционерное общество «Агрокапитал» действует на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-1246-1097 Министерства финансов Республики Беларусь (срок действия лицензии – бессрочно).

6. Основные виды деятельности Эмитента.
Основным видом деятельности Эмитента является управление недвижимым имуществом (код 68320 согласно общегосударственному классификатору Республики Беларусь ОКРБ 005-2011 «Виды экономической деятельности»).

7. Дата принятия, дата утверждения и наименование органа, принявшего (утвердившего) решение о выпуске Облигаций.
Решение о семнадцатом выпуске жилищных облигаций принято Общим собранием участников Эмитента 29 декабря 2017 года (протокол от 29 декабря 2017 года).
Решение о семнадцатом выпуске жилищных облигаций утверждено Общим собранием участников Эмитента 12 февраля 2018 года (протокол от 12 февраля 2018 года).

8. Вид, форма и номер выпуска Облигаций.

Вид и форма Облигаций	Жилищные, бездокументарные, именные, конвертируемые
Номер выпуска Облигаций	Семнадцатый

9. Объем выпуска Облигаций, количество Облигаций, номинальная стоимость Облигации.
Объем выпуска Облигаций составляет 477 180 белорусских рублей.
Количество Облигаций – 723 штуки.
Номинальная стоимость одной Облигации составляет 660 белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения по СНБ в строящемся в составе объекта «Группа жилых домов типовых потребительских качеств в границах улиц Тимирязева, Панфилова, Москвина, Репина в г. Минске» (III-я очередь – жилой дом № 7 по генплану) жилом доме №7 по генплану.
Общий эквивалент номинальной стоимости Облигаций составляет 723 квадратных метра.
Эквивалент номинальной стоимости Облигаций не подлежит изменению в течение срока обращения Облигаций настоящего выпуска.

10. Дата и государственный регистрационный номер выпуска Облигаций.
Выпуск облигаций зарегистрирован Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 07 марта 2018 года.
Государственный регистрационный номер: 5-200-02-3290.

11. Цель эмиссии Облигаций и направление использования средств, привлеченных путем эмиссии Облигаций.
Целью эмиссии Облигаций является привлечение денежных средств физических и (или) юридических лиц – резидентов и нерезидентов Республики Беларусь – для осуществления строительства объекта «Группа жилых домов типовых потребительских качеств в границах улиц Тимирязева, Панфилова, Москвина, Репина в г. Минске» (III-я очередь – жилой дом №7 по генплану), в том числе для обеспечения хозяйственной деятельности Эмитента, связанной с выполнением им функций заказчика (застройщика).
Направление использования средств, привлеченных путем эмиссии Облигаций, – в соответствии с целями эмиссии.

12. Способ обеспечения исполнения обязательств Эмитента по Облигациям.
Эмитент в соответствии с абзацем четвертым части первой подпункта 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 №277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» (далее – Указ № 277) осуществляет эмиссию необеспеченных Облигаций, то есть без учета положений, предусмотренных в подпункте 1.7 пункта 1 Указа №277.

13. Способ размещения Облигаций.
Размещение Облигаций осуществляется Эмитентом путем открытой продажи физическим и (или) юридическим лицам – резидентам и нерезидентам Республики Беларусь – на неорганизованном рынке на основании договора купли-продажи (размещения) Облигаций.
До момента приобретения Облигаций (как в процессе размещения Облигаций, так и в процессе обращения Облигаций) инвесторы должны заключить с Эмитентом договор (соглашение) в простой письменной форме, предусматривающий обязательства Эмитента по строительству жилого помещения владельцу Облигаций.
Открытая продажа Облигаций осуществляется по цене, определяемой Эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи Облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.

14. Срок размещения Облигаций.
Дата начала открытой продажи (размещения) Облигаций: 01 марта 2018 года.
Дата окончания открытой продажи (размещения) Облигаций: 25 февраля 2019 года, если иная дата не будет определена Общим собранием участников Эмитента в порядке и срок, установленные законодательством о ценных бумагах.

15. Сведения о месте, дате и времени проведения размещения Облигаций.
Размещение Облигаций путем открытой продажи осуществляется Эмитентом в течение срока, указанного в пункте 14 настоящего документа, самостоятельно ежедневно, за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством, с 9.00 до 18.00 по адресу: Республика Беларусь, 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1 этаж, каб. 60.

16. Срок обращения Облигаций устанавливается с 01 марта 2018 года по 28 февраля 2019 года включительно и составляет 364 календарных дня.

17. Доход по Облигациям не начисляется и не выплачивается.

18. Дата начала погашения Облигаций: 28 февраля 2019 года.

19. Дата формирования реестра владельцев Облигаций с целью погашения Облигаций.
Правом на получение денежных средств или жилого помещения при погашении Облигаций обладают лица, указанные в реестре владельцев Облигаций, сформированном депозитарием Эмитента по состоянию на 28 февраля 2019 года.

20. Место, время и способ ознакомления с Проспектом эмиссии Облигаций.
С более подробной информацией и Проспектом эмиссии Облигаций можно ознакомиться в течение срока размещения Облигаций ежедневно, за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством, с 9.00 до 18.00 по адресу: Республика Беларусь, 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1 этаж, каб. 60. Ознакамливающееся лицо имеет право читать и делать выписки из предоставляемых документов в соответствии с настоящим пунктом.

Директор СООО «ВильнюсСтрой» Н.М.Яколцевич
Главный бухгалтер СООО «ВильнюсСтрой» Т.С.Журавская

ПЫТАЛЬНІК

Хачу на дровы бабровы павал

Але ў лясніцтве сказалі: нельга. Чаму?

З вёскі Якавічы Браслаўскага раёна патэлефанавала Інеса Іванаўна Астапко. Сказала, што хацела нарыхтаваць дровы, званіла з гэтай нагоды ў Опсаўскае лясніцтва. Прасіла выдзеліць або дзялянку з лесам на пні, або бабровыя павалы.

— Мне адмовілі, сказалі, што не могуць выдзеліць. А мне сусед якраз даў пачытаць «Звязду» ад 27 лютага, дзе вы пішаце, як можна нарыхтаваць бураломную драўніну — па ордары і на платнай аснове. Чаму тады мне нельга? Купляць гатовыя дровы пры нашых невялікіх зарплатах дорага, мы хацелі б іх самі нарыхтаваць. Нас бы 10 кубоў цалкам задаволілі, — гаварыла заяўніца.

Па каментарыі мы звярнуліся да **Уладзіслава ЦЕЦЯРОНКА, галоўнага ляснічага Нацыянальнага парку «Браслаўскія азёры»,** на тэрыторыі якога знаходзіцца вёска жанчыны.

Суразмоўнік растлумачыў, што з 1 студзеня 2017 года ўступіў у сілу Лясны кодэкс Рэспублікі Беларусь. Дык вось, згодна з ім, на тэрыторыі нацпарку (гэта датычыцца не толькі яго) забаронены высечкі, калі яны не былі запланаваны лесаўладкаваннем. Таму фізічным асобам цяпер і нельга набыць лес на пні ці заняцца нарыхтоўкай дроў з бабровых павалаў. Тыя высечкі, якія прызначаюцца самастойна, можа праводзіць толькі сам лясгас. Адпаведна, толькі ў яго ахвотныя могуць набыць дровы, але ўжо гатовыя.

Як расказаў Уладзіслаў Віктаравіч, заяўніцы з вёскі Якавічы было прапанавана наведаць лясніцтва, каб на месцы атрымаць больш падрабязныя адказы на яе пытанні. Пакуль яна там не з'яўлялася.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЁСЦЬ ВУЛІЦЫ ЦЭНТРАЛЬНЫЯ...

У кожнага з нас ёсць свая маленькая радзіма — вёска, вуліца, двор, з якімі звязаны самыя светлыя ўспаміны. Мы вяртаемся туды ў марах, наведваем іх на выхадныя, раз у месяц, год. І не заўсёды ўдзяляем увагу назве вёскі, вуліцы — адкуль яна пайшла, што абазначае, ці мілагучная...

Было гэта гадоў дзесяць таму. Патэлефанаваў знаёмы з Магілёўскай вобласці, папрасіў дапамагчы адшукаць чалавека з нашага раёна, пра якога вядома толькі наступнае: завуць яго Анатоль, 45 гадоў, жыве ў адной з вёсак Уздзеншчыны, кіламетраў за 10—15 ад райцэнтра, па вуліцы Цэнтральнай. Пачаў пошукі. І ўжо праз некалькі дзён пераканаўся, што наўрад ці ў мяне атрымаецца дапамагчы. Як высветлілася, вуліцы з такой назвай маюцца ў Борках і Цялякаве, Чурылаве і Ліцвянах, Нізку і Літве, Ракашычах і Слабадзе, Гарадку і Хароміцкіх...

Нядаўна з дапамогай кіраўнікоў спраў сельвыканкамаў вырашыў зрабіць «рэвізію» назваў вуліц сельскіх населеных пунктаў. І высветлілася, што вуліцы і завулкі з такой назвай маюцца ў... 164 вёсках і пасёлках са 199, што пазначаны на карце Уздзеншчыны. На тэрыторыі Хатлянскага сельсавета такія сустрэнеш у 37 з 38 паселішчаў, Уздзенскага — у 37 з 40, Слабадскога — у 43 з 50, Нёманскага — у 20 з 27.

З чаго пачыналася

Яшчэ гадоў дваццаць таму далёка не ўсе вёскі мелі назвы вуліц — у асноўным толькі тыя, дзе была не адна, а некалькі транспартных артэрый. І паштальёны, іншыя службы не блудзілі, а карэспандэнцыя з адрасам, скажам, «Ліцвяны, Пятрову П. П.» знаходзіла свайго адрасата, не кажучы ўжо пра вёсачку, дзе на адной вуліцы размяшчаўся дзясятак-другі дамоў. Пазней, прыкладна з пачатку XXI стагоддзя, калі пачалі інтэнсіўна развівацца аграгарадкі і больш масавы маштаб набылі аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва па дзяржаўных праграмах развіцця вёскі, літаральна за некалькі гадоў у некаторых населеных пунктах з'явіліся цэлыя мікрараёны грамадскай і індывідуальнай забудовы. Пачалі ўзнікаць цяжкасці пры складанні спісаў выбаршчыкаў, афармленні пэўных дзяржаўных актаў, іншых афіцыйных дакументаў. А калі звычайных паштальёнаў замяніла мотадастаўка, і ўвогуле праблем стала больш.

Прыкладна ў 2005—2006 гадах было прынята рашэнне даць назву кожнай з вуліц сельскіх населеных пунктаў. Падобная акцыя праводзілася не толькі ў нашым раёне, а па ўсёй краіне. Магчыма, не ўсё было дасканала прадумана на адпаведным узроўні, магчыма, няшмат часу адвялі для выканання такой няпростай работы (падціскалі тэрміны канчатковай рэгістрацыі ўтвораных назваў), але скончылася ўсё тым, што маем і сёння. Каб паскорыць завяршэнне справы, хтосьці з чыноўнікаў раённага, а то і вышэй, звяна парэкамендаваў непасрэдным выканаўцам: а што тут доўга думаць, калі ў вёсцы адна вуліца — яна і ёсць цэнтральная, так і рэгіструйце.

У асноўным так і зрабілі. Хіба што на тэрыторыі былога Цепленскага сельсавета (цяпер гэта частка Дзешчанскага) праявілі ініцыятыву і пакінулі для нашчадкаў не бязлікія «цэнтральныя» вуліцы, а вытворныя ад назваў населеных пунктаў: вёска Прохады

Фота Сяргея ШАРАЯ.

— вуліца Прохадская, Сянное — Сянноўская, Трысцянец — Трысцянецкая, Подзелень — Подзеленская...

Яна такая не адна

Некаторыя населеныя пункты раёна маюць па 10—15, а то і больш вуліц. У аграгарадку Возера — 23 вуліцы і 2 завулкі, у Валодзьках і Зенькавічах — па 18, Каралёве — 16, Дзешчанцы — 15, Ліцвянах і Магільным — па 11. Зразумела, адразу прыдумаць ім цікавыя, адметныя менавіта для гэтай мясцовасці назвы было б няпроста. Не тое што ў вёсцы, нават у многіх райцэнтрах не існуе, у адрозненне ад сталіцы ды абласных цэнтраў, тапанімічных камісій. Толькі ў апошнія дзесяцігоддзі архітэктурныя службы ды спецыялісты райвыканкамаў пры планаванні раёнаў гарадской і індывідуальнай жылой забудовы для надання будучым вуліцам назваў заслухоўваюць меркаванні супрацоўнікаў музеяў, мясцовых краязнаўцаў. Раней падобныя пытанні вырашаліся на сходах жыхароў, будучых насельнікаў той ці іншай вуліцы: нам тут жыць, давайце падумаем, на вуліцу пад якой назвай нам будуць прыходзіць лісты ды газеты.

Не ў такой колькасці, як у гарадах, але і ў сельскай мясцовасці сярод тапонімаў, асабліва створаных яшчэ пры савецкім часе, прысутнічае так званая рэвалюцыйная тэматыка. На Уздзеншчыне можна знайсці такія назвы вясковых вуліц, як Кастрычніцкая, Пралетарская, Савецкая, Камсамольская, Першамайская, Інтэрнацыянальная, завулак Піянерскі. Крыху больш нейтральныя — вуліцы Партызанская, Перамогі, Дружная, Мірная; ад роду заняткаў — Калгасная, Рабочая, Прамысловая, Фабрычная, завулак Працоўны.

З мясцовым каларытам

Мне ж больш даспадобы назвы, якія ўказваюць на канкрэтную мясцовасць, падзею, асобу. Напрыклад, жыхары вёскі Прусінава, паблізу якой да 1939 года праходзіла мяжа паміж Усходняй і Заходняй Беларуссю, назвалі вуліцу Пагранічнай. Паблізу Возера ў гады Вялікай Айчыннай і пасля вызвалення Беларусі стаялі падраздзяленні авіяцыі — пра гэта сёння нагадвае вуліца Аэрадромная, а Інстытуцкая ў гэтым жа населеным пункце сведчыць пра цеснае супрацоўніцтва ў недалёкім мінулым мясцовага сельгаспрадпрыемства з інстытутам бульбаводства і плодаагародніцтва. Дзяржынская і Мінская з таго ж Возера падкажуць напрамак да найбліжэйшых гарадоў. Пра гэта засведчыць і вуліца Уздзенская з Калінінска. Бліжэй да дарогі размешчана Прыдарожная ў Язвінах, а завулак Клубны ў Віркове раней прыводзіў да ўстановы культуры. Чамусьці заблудзіла ў Касцяшы вуліца Алімпійская...

Асобная размова пра імянныя вуліцы. У адрозненне ад райцэнтра, дзе такіх шмат, з савецкага мінулага ў вёсках раёна засталіся толькі дзве вуліцы, названыя ў гонар расійскіх герояў: імя Ракасоўскага ў Магільным ды Гагарына ў Лошы. Сваіх землякоў уздзенцы шануюць больш. У вёсцы Кухцічы ёсць вуліца імя Героя Савецкага Саюза У. Карачуна, у Новым Шляху і Ліцвянах — імя воінаў-інтэрнацыяналістаў А. Мысліўца і У. Астравуха. Вялікая Уса — радзіма пісьменніка і грамадскага дзеяча П. Глебкі, гэта засведчыла і назва вуліцы. Імя абаронцы Брэсцкай крэпасці, пісьменніка Алеся Махнача ўвекавечана ў назвах вуліц у Світалаўцы і п. Новы, хоць нарадзіўся ён у Забалацці, што непадалёку. І Марат Казей родам з суседняй Дзяржыншчыны, але здзейсніў ён свой подзвіг паблізу нашай вёскі Хароміцкія, пра што нагадваюць сёння вуліцы ў гэтым населеным пункце і ў Лошы. А вось вуліца Уладзімірская ў Дзегцяным невядома каго праслаўляе, пэўную канкрэтную асобу ці ўвогуле ўсіх мужчын з такім імем.

Разам з тым чакаюць увекавечвання ў назвах вясковых вуліц П. Трус, К. Крапіва, Л. Арабей з Нізка, А. Пальчэўскі з Прусінава, А. Якімовіч з Чурылава, многія іншыя знакамітыя землякі — дзеячы навукі, культуры, літаратуры...

Мілыя сэрцу

Шмат на Уздзеншчыне вуліц, названых хай і без асаблівай фантазіі, але цёпла, шчыра, проста. Напэўна, больш як у дзесяці вёсках можна прайсціся па вуліцах Маладзёжнай, Садовай, не раз сустракаюцца і Зарэчная, Школьная, Лугавая, Лясная, Сонечная, Палявая, Зялёная, Набярэжная. Куды больш арыгінальна, мілагучна гучаць Рабінавая (вёска Рабінаўка), Сунічная, Бярозавая і Ягадная (Валодзькі), Дубовая алея (Басманоўка), Крынічная (Магільна), Азёрная (Сенажаткі), Ціхая, Прыгожая, Язмінавая ў Возеры. А яшчэ ёсць Вішнёвая, Кветкавая, Паркавая, Баравая, Сасновая, Пясчаная, Падлесная.

Гэта куды лепш, чым 1-я, 2-я, 3-я і 4-я ў аграгарадку Хатляны, 1-ы праезд Будаўнікоў і 2-і праезд Будаўнікоў у Валодзьках...

Віктар САБАЛЕЎСКІ, *Уздзенскі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.,** старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.,** старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. **Нумар падпісаны ў 19.30 9 сакавіка 2018 года.**